Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 ЖНІЎНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 161 (28019) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



Ці могуць падручнікі быць ідэальнымі?

СТАР. 6



Прырода не церпіць умяшання

СТАР. 8



Еўрасаюз захлынаецца ад бежанцаў

СТАР. 12

## ПАКУЛЬ ЯШЧЭ КАНІКУЛЫ!



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл МЯСНІКОВІЧ, старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу:**

*«Неабходна актывізаваць работу па вырашэнні на месцах актуальных праблем жыццезабеспячэння. І ў гэтым плане трэба не толькі канстатаваць пэўную сітуацыю, а працаваць на апярэджанне. Дэпутаты ўсіх узроўняў — людзі кампетэнтныя, яны бачаць недахопы, якія могуць справакаваць звароты грамадзян або нездаволенасць пэўных груп людзей. Звароты грамадзян — не проста форма працы, якая набіла аскоміну, а ўзаемадзеянне з насельніцтвам. І калі тут будзе менш фармалізму, а дэпутаты ўсіх узроўняў будуць сапраўды паглыбляцца ў тыя праблемы, якімі жыве адпаведная акруга (рэгіён), то будзе менш нараканняў на дзеянні ўлад».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.08.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17601,00 | ▲ |
| Еўра | 19935,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 247,30 | ▲ |
| Укр. грыўня | 780,71 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Жніво-2015

# ВЯРХОМ НА «ЛЕКСІЁНЕ»,

## або Як карэспандэнтка «Звязды» падмяняла памочніцу камбайнера

**Калі пачула, што ў агракамбінаце «Зара», што ў Магілёўскім раёне, на камбайне працуе прадстаўніца слабага полу, вельмі здзівілася: хіба жаночая гэта справа? А калі даведалася, што Алена яшчэ і другая палова аднаго з найлепшых камбайнераў гаспадаркі, вырашыла дарэмна час не губляць. Жніво ўжо выйшла на фінішную прамую, а хацелася пабачыць мужа з жонкай у справе. Тым больш што Уладзімір і Алена Корсакі трымаюць высокую марку, іх экіпаж — адзін з лідараў у Магілёўскай вобласці, на іх рахунку болей за 5 тысяч тон збожжа!**



Дзякуй кіраўніку гаспадаркі Аляксандру Корневу, які аператыўна і транспарт выдзеліў, і намесніка па раслінаводстве Яўгена Сялюгіна ў якасці гіда даў. Бо знайсці пару ў полі без староннняй дапамогі было немагчыма. Пакуль ехалі, Яўген уводзіў у курс справы. Гаспадарка багатая не толькі на перадавікоў, але і на моладзь. Сам Яўген тут працуе трэці год і мяняць вёску на горад не збіраецца. А навошта, калі да Магілёва ўсяго 8 кіламетраў? Да таго ж такія заробкі яшчэ не ўсюды ў горадзе знойдзеш.

Уладзімір і Алена Корсакі паспрабавалі шчасця спачатку ў круглянскай гаспадарцы «Шлях Леніна», а 12 гадоў таму пераехалі ў Магілёўскі раён ды тут і засталіся. Работа добрая, жыллё гаспадарка выдзеліла, ёсць дзе выхоўваюць чацвярых дзяцей. Старэйшы сын-цёзка Уладзімір апошнія два гады з бацькам у пары на жніве працаваў. Летась на абласных «Дажынках» «Бабулін гладыш» ім машыну прэзентаваў. А перад гэтым яны, як героі жніва, атрымалі ключы ад першага свайго аўто з рук кіраўніка дзяржавы.

Сёлета старэйшы сын адсутнічае — служыць у войску. Ён зараз у спецназе, чым вельмі ганарыцца. Ратнай справай займаецца не горш, чым уборкай ураджаю. Бо ў вялікай сям'і Корсакаў лайдакоў наогул няма.

СТАР. 3

■ Надвор'е

# ДА КАНЦА ТЫДНЯ БУДЗЕ ЦЁПЛА

**Цёплае і камфортнае надвор'е захаваецца ў Беларусі да канца тыдня, паведаміў БЕЛТА начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Дзмітрый РАБАЎ.**

Сёння будзе пераважна без ападкаў, вечарам месцамі па паўднёвым захадзе Гродзенскай і Брэсцкай абласцей пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра днём будзе 25-29 градусаў, у паўднёва-заходніх раёнах паветра прагрэецца да 30-31 градуса. У сераду праз краіну будзе праходзіць атмасферны фронт з Заходняй Еўропы, месцамі прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Тэмпература паветра ноччу складзе 10-17 градусаў, днём — 20-26 градусаў.

Далей уладу над надвор'ем возьме чарговы антыцыклон. У чацвер будзе пераважна без ападкаў, толькі ноччу з адыходзячым фронтам у асобных раёнах па паўночным усходзе магчымы кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ноччу складзе 8-15 градусаў, днём — 22-27 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 29 градусаў. У пятніцу будзе без ападкаў.

## СУСЕДЗІ ПАВІННЫ ЖЫЦЬ У ЗГОДЗЕ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр ЛУКАШЭНКА і кіраўнік прадстаўніцтва Еўрасаюза ў нашай краіне Майра МОРА падчас сустрэчы адзначылі паляпшэнне адносін паміж ЕС і Беларуссю.**

Перамовы прайшлі з нагоды завяршэння дыпламатычнай місіі Майры Моры ў Беларусі, і Прэзідэнт высока ацаніў яе дзейнасць, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы. «Вы зрабілі нямала для таго, каб мы не толькі пачалі размаўляць з вялікай Еўропай, але і у нечым разумець адно аднаго, наладжваць нашы адносіны», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы выказаў упэўненасць, што, нягледзячы на ад'езд Майры Моры з Беларусі, яна застанецца сапраўдным сябрам краіны. Прэзідэнт запрасіў яе ў любы зручны час наведваць Беларусь. Адзначаючы ўклад кіраўніка прадстаўніцтва ў развіццё адносін паміж Беларуссю і ЕС, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Мы ведаем, што вы рабілі вельмі многае шчыра, і, калі не маглі нечага зрабіць, маўчалі, і мы разумелі гэтае маўчанне».

Прэзідэнт адзначыў, што сустракаецца далёка не з усімі пасламі, якія завяршаюць сваю дыпламатычную місію. І факт гэтай сустрэчы гаворыць сам за сябе. «Гэта прызнанне нашай краіны значэння чалавека, які прысвяціў сябе таму, каб палепшыць адносіны, а не разарваць, не пагоршыць, як гэта часам бывае», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. На яго думку, работа Майры Моры з'яўляецца ў пэўным сэнсе «ўзорам паводзінаў пасла ў краіне знаходжання». «Пасол павінен склейваць, аб'ядноўваць, але ні ў якім разе не рваць і не раз'ядноўваць», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

У сваю чаргу, кіраўнік прадстаўніцтва ЕС сказала, што пакідае Беларусь на хвалі паляпшэння стасункаў з Еўрасаюзам. «Жадаю, каб адносіны такімі заставаліся і надалей, таму што мы суседзі і павінны жыць у міры і згодзе», — сказала Майра Мора. Яна падзякавала Прэзідэнту Беларусі за высокую ацэнку яе дыпламатычнай дзейнасці. Майра Мора лічыць падарункам лёсу той факт, што ёй двойчы давялося працаваць у Беларусі: першапачаткова пасланом Латвіі, а затым кіраўніком прадстаўніцтва ЕС. Яна лічыць важным, што сёння адносіны Беларусі і Еўрасаюза паляпшаюцца. «Мая прафесія — дыпламат. Гаворкі, кантакты — гэта наша зброя. Трэба не адмяжоўвацца, а, наадварот, абмяркоўваць усе, нават вострыя, пытанні, што я гэтыя гады і рабіла», — сказала Майра Мора.

На сустрэчы абмеркаваны актуальныя пытанні міжнароднага парадку дня. Акрамя таго, была адзначана роля Беларусі як важнага звяна падтрымання стабільнасці і бяспекі ўвогуле ў Еўропе.

■ Выбары-2015

# ПОДПІСЫ — ПРАВЯРАЮЦЦА

## Кандыдатам у Прэзідэнты можа стаць жанчына

**Пяць з васьмі прэтэндэнтаў на пост Прэзідэнта пераадолелі неабходны бар'ер у 100 тысяч подпісаў. Гэта Аляксандр Лукашэнка, Мікалай Улаховіч, Сяргей Гайдукевіч, Віктар Цярэшчанка і Тацццяна Караткевіч. Пра гэта падчас свайго традыцыйнага відэазвароту на сайце Vybory2015.by паведаміла старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні дзяржаўных рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА.**

— Мы можам ужо паведаміць пра агульныя рысы асноўнага дня галасавання, — адзначыла яна. — Як мяркуецца, у выбарах будуць удзельнічаць 5 патэнцыяльных прэтэндэнтаў або кандыдатаў у Прэзідэнты. Усё гэта будзе ўстаноўлена да 10 верасня.

Як паведамляецца, ініцыятыўная група Аляксандра Лукашэнкі сабрала 1 760 тысяч подпісаў, група Мікалая Улаховіча — амаль 160 тысяч, Сяргея Гайдукевіча — трошкі больш за 140 тысяч, Віктара Цярэшчанкі — больш за 130 тысяч і Тацццяны Караткевіч — каля 107 тысяч подпісаў.

— Я вельмі рада за спадарыню Караткевіч, — прызналася старшыня ЦВК, — паколькі гэта першы ў гісторыі сучаснай Рэспублікі Беларусь магчымы кандыдат у Прэзідэнты — жанчына. Я жадаю поспехаў гэтаму кандыдату, менавіта яна з'яўляецца тым новым, асаблівым паваротным момантам у гісторыі выбараў у Прэзідэнты нашай краіны, найперш таму што яна жанчына. Я дзякую Жанне Раманоўскай, хоць тая змагла сабраць толькі 780 подпісаў, тым не менш яна правяла сваю кампанію сумленна і мужна, і гэта дарагога варта.

— Цяпер тэрытарыяльныя камісіі раёнаў і гарадоў пачынаюць праверку падпісных лістоў, прадстаўленых ініцыятыўнымі групамі, — паведаміла старшыня Цэнтральнай камісіі. — Спачатку будуць выключаны подпісы, сабраныя на тэрыторыі іншых адміністрацыйна-тэрытарыяльных утварэнняў, а таксама выключаныя членамі ініцыятыўнай групы. Потым пачнецца адбор подпісаў для праверкі.

Для яе бярэцца не менш за 20% ад колькасці здадзеных подпісаў. У тым выпадку, калі больш за 15% з ліку правераных будуць прызнаны недакладнымі, будзе ўзята яшчэ 15% подпісаў з ліку здадзеных у тых кандыдатаў, дзе патрабуецца паўторная праверка.

— Калі агульная колькасць недакладных подпісаў па сумах двух праверак складзе больш за 15%, усе подпісы, сабраныя па дадзеным раёне, горадзе, будуць прызнавацца несапраўднымі і не будуць улічвацца ў агульным балансе подпісаў, якія прадставілі ініцыятыўныя групы ў падтрымку вылучэння кандыдата ў Прэзідэнты, — адзначыла Лідзія Ярмошына.

Старшыня ЦВК выказала спадзяванне, што ініцыятыўныя групы прэтэндэнтаў на пасаду Прэзідэнта змаглі сабраць подпісы якасна, памылак будзе няшмат і ўсё тыя, хто здаў у пятніцу подпісы і падпісныя лісты, будуць зарэгістраваны ў якасці кандыдатаў і ўступяць у цікавую перадвыбарную агітацыйную кампанію.

Падчас відэазвароту Лідзія Ярмошына паведаміла, што 23 жніўня завяршыўся тэрмін падачы дакументаў аб вылучэнні прадстаўнікоў ва ўчастковыя выбарчыя камісіі, а 26 жніўня — апошні дзень для ўтварэння ўчастковых выбарчых камісій.

— Менавіта пасля 26 жніўня пачнецца вельмі важная праца па ўдакладненні спісаў выбаршчыкаў, — звярнула ўвагу старшыня Цэнтрвыбаркама. — Ёй займуцца ўчастковыя выбарчыя камісіі, якія прадстаўяць першачарговыя прапановы ў мясцовыя выканаўчыя і распарадчыя органы. Па выніках удакладнення спісаў выбаршчыкаў будуць складзены дакладныя спісы, па якіх будуць накіроўвацца запрашэнні наведаць выбарчы ўчастак.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Пра людзей і пра сябе

Валерый БАРАДЗЕНЯ:

# «НЕСЦІ АДКАЗНАСЦЬ ХАЦЯ Б ЗА САМОГА СЯБЕ — ГЭТА ЎЖО НЯМАЛА»

**Мы прывыклі размаўляць з імі пра распрацоўку законаў і надзённыя праблемы беларусаў. Афіцыйна, суха і па факце. А між іншым, парламентарыі — гэта людзі, вартыя ўвагі за іх светапогляд, уласную філасофію і лад жыцця.**

**З Валерыем БАРАДЗЕНЕМ, дэпутатам, членам Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі па бюджэце і фінансах,** мы размаўлялі ў кавярні непадалёк ад Дома ўрада, дзе на яго густ — самая смачная кава. У апрыёры нефармальнай размове ён расказаў, як выхоўваць дзетак (а іх у Валерыя Анатольевіча трое), дзе лепей адпачываць летам, як можна палепшыць эканоміку краіны, і прызнаўся, што беларусы — прыўкрасныя людзі.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

***— Вам шмат давозіцца працаваць з людзьмі. Значыцца, вы іх лепей разумееце, чым хтосьці іншы. Якія яны, беларусы?***

— Я лічу, што Беларусь — еўрапейская краіна. Каштоўнасці нашых людзей бліжэйшыя да Еўропы. У тым ліку і ў плане адкрытасці. Беларусь сярод усіх постсавецкіх краін — першая па колькасці выдадзеных шэнгенскіх віз. Уяўляеце: мы абышлі нават расіян! Калі параўнаць па колькасці насельніцтва, то Расія амаль у 15 разоў нас пераўзыходзіць. Гэта дзіўна, бо Захад ад нас адмяжоўваецца, абвінавачвае ў недахопе дэмакратычнасці кіравання. Але, як паказвае практыка, беларусы — адны з самых прыстойных турыстаў. У нас найменшая колькасць адміністрацыйных правапарушэнняў. Але, з іншага боку, наколькі адкрытыя, настолькі і закрытыя: мы цяжка падпускаем людзей да сябе.

***— У чым мы дакладна не падыходзім пад прыметнік «еўрапейская», дык гэта па дэмаграфічнай сітуацыі.***

— Цалкам згодны. Гэта ўвогуле дзіўная заканамернасць: чым лепей эканоміка дзяржавы, тым меней у ёй нараджаецца дзетак, прагрэсіруе старэнне нацыі. Паказчыкі ў Афрыцы і Еўропе супрацьлеглыя. Хаця на паўднёвым кантыненце ў некаторых краінах жывуць **на 2 долары ў месяц**, але большасць сем'яў там — шматдзетныя. А ў Еўропе, наадварот, з'явілася тэндэнцыя нараджаць пасля 30, а тое і пазней. Але гэта ўжо зусім іншы фізічны рэсурс... Чаму так адбываецца? Калі матэрыяльныя радасці недасяжныя, яны замяняюцца шчасцем дзетараджэння. Што таксама не самы дрэнны варыянт. Беларусь у гэтым плане адшукала залатую сярэдзіну.

***— З чым яшчэ зараз сутыкнулася Еўропа?***

— Найперш за ўсё — з масавай міграцыяй. Эмігранты, калі прыязджаюць у Еўропу, не ўспрымаюць яе культуру, а прывозяць сваю. Не асімілююцца, а, наадварот, адасабляюцца ў асобныя раёны, дзе множаць бандытызм і злачынствы. У такія месцы паліцэйскія ў цёмны час сутак нават не заязджаюць, а ў светлы завітваюць адразу па некалькі машын — да 10-ці за раз. Бо там сапраўды небяспечна: вечарам могуць абабкрасці і збіць. Я быў у Францыі, там увогуле не прынята вечарам хадзіць па вуліцы. Калі вярнуўся са шпацыру жывы і здаровы, мае сябры-французы былі шчыра здзіўлены. Яшчэ адзін бок дэмакратыі — гэта бамжы, якіх можна сустрэць наўпрост на вуліцы. Ім хапае некалькіх метраў для таго, каб здзяйсняць усё неабходнае для жыццядзейнасці. Не толькі есці і спаць... Гэта адваротны бок дэмакратычнай палітыкі.

***— З Еўропай нарэшце разабраліся. Мяне цікавіць крыху іншы бок жыцця. Я ведаю, што ў вас, Валерый Анатольевіч, трое дзетак. Якіх правілаў вы прытрымліваецеся, выхоўваючы іх?***

— Пра гэта вам лепей расказа мая жонка *(смяецца)*. Зараз мае дзеці ходзяць у гурткі: малююць, спяваюць, граюць на інструментах. Я ж рос у вёсцы. Там не было занятак для творчасці. Бяры паперу — і малюй. Хочаш гуляць у футбол — выходзь на вуліцу і кліч сяброў. У дзяцінстве я перачытаў усю вясковую бібліятэку з гэтай нагоды. Можа, тысячы дзве кніг. Зараз у горадзе дзетак водзяць на заняткі самага рознага кшталту. Але гэта не абавязковая ўмова для таго, каб у будучыні вырас паспяховы дарослы чалавек. Зірніце, колькі талентаў выйшла з вёскі... Усё залежыць ад самога цябе, ад прыродных здольнасцей. І ўвогуле, што тут дарма казаць: дзяцей трэба не толькі развіваць, але і папросту любіць. І гэта ўжо нямала.

***— А дзе вы з імі бавіце час, як адпачываеце?***

— Адпачынак у гэтым годзе я правёў з усёй сям'ёй на Браслаўскіх азёрах. Мы жылі ў палатках на кемпінгу «Панцялееўскі рог». З намі былі нашы сябры — сям'я з двума дзецьмі. Так удзевяцерых прабылі там адзінаццаць дзён. Праўда, было холадна, ішоў дождж. Купаліся толькі два апошнія дні. Але ўсе засталіся вельмі задаволеныя. Палаткі, ровары, а мой сябра яшчэ і вяроўкі ўмее нацягваць — можна лазіць. Сумна не бывае! Гэтаксама мы адпачывалі і ў мінулым годзе. Дзецям падабаецца, таму і прыехалі зноў. Увогуле, па выхадных ездзім да бабулі ў агарод — трэба дапамагаць. Падчас навучальнага года складана куды-небудзь вырвацца: дзеці ходзяць у суботу і нядзелю ў музычную школу і гурткі для развіцця.

***— Скажыце, ці адбіваецца тое, што вы працуеце ў камісіі па бюджэце і фінансах, на вашым жыцці? Напрыклад, уздзейнічае на фарміраванне сямейнага бюджэту?***

— Насамрэч не. Гэта зусім розныя маштабы.

***— Ведаеце, Маргарэт Тэтчар казала, што жанчына, якая ўмее весці хатнюю гаспадарку, справіцца і з кіраваннем дзяржавай.***

— Можа, жанчына і зможа *(смяецца)*. Я не прэтэндую. І ўсё ж такі маштабы гэтых двух сістэм не дазваляюць правесці такое параўнанне. Калі гутарка ідзе пра сям'ю, то рашэнні прымаюцца мабільна, тут і адразу. У межах дзяржавы столькі месца для манеўраў няма. У нашым бюджэце традыцыйна шмат увагі надаецца сацыяльнай сферы, якая павінна стабільна забяспечвацца. Тыя ж зарокі бюджэтнікам. Сёння ў нас не так шмат грошай, як хацелася б. Таму іх трэба рацыянальна размяркоўваць. Але мы часта забываемся на тое, што фінансавы поспех краіны залежыць ад працы кожнага з нас.

***— А ці ёсць кнігі, якія сфарміравалі ваш светапогляд?***

— Думаю, што сюды можна аднесці кнігі, якія масава выдаваліся ў Савецкім Саюзе. Напрыклад, трылогія Тэадора Драйзера «Фінансіст», «Тытан» і «Стоік». Усім, хто скардзіцца, што ў нас «не такая» эканоміка, раю пачытаць. У гэтых кнігах адлюстравана, як адбывалася станаўленне рынкавай эканомікі ў Амерыцы. Набыў яблыкі, памыў, прадаў на 2 цэнты даражэй і пусціў у абарот выручаныя грошы. Праз колькі гадоў і чыгунку набыў... Ці, напрыклад, стварыў акцыянернае таварыства. Значыць, меў ідэю, пераканаў іншых людзей, што ў яе ёсць сэнс укласці грошы, прадаў акцыі, атрымаў капітал і нарэшце рэалізаваў ідэю. Акцыі пачалі каціравацца — і справа пайшла.

***— А ў нас?***

— Іншая сістэма, людзі не да канца адчуваюць асабістую адказнасць пры прыняцці рашэнняў. Так зараз і атрымліваецца: з набыццём незалежнасці мы «ўскочылі» ў рынкавую эканоміку, але ўнутры — усё яшчэ савецкія людзі, наша свядомасць пакуль не «дабегла» да навакольнай рэчаіснасці. Майму пакаленню складана зразумець, што ніхто табе нічога не павінен (і дзяржава таксама), ты ўсё абавязаны здабыць сам. У Амерыцы дзеці з 10-12-гадовага ўзросту заклапочаны тым, як зарабіць кішэнныя грошы. А нашы? Адсюль і іншы менталітэт. Несці адказнасць хаця б за самога сябе — гэта ўжо нямала. Ды і дзяржаве лягчэй.

***— Ці здольны мы на гэта?***

— Я думаю, што так. У нас, насамрэч, шмат крэатыўных, творчых асоб, якія здольны падаваць новыя, унікальныя ідэі. У гэтым і ёсць самастойнасць. Мала хто ведае, але самая папулярная ў свеце анлайн-гульня «World of Tanks» — вынаходства беларусаў. «Viber» — таксама наш прадукт. І гэта толькі тое, што ляжыць на паверхні. Мы не кранаем медыцыну, банкаўскую сферу... Але для творчасці павінна быць свабода і ў той жа час канкурэнцыя, вольныя ад кантролю дзяржавы камерцыйныя нішы. Мы нават не ўяўляем, якія станоўчыя змены чакаюць нас, калі будзем мець смеласць рэалізоўваць свае ідэі.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

**P.S.** *Калі кава і гарбата былі ўжо даўно выпіты, да нас падышоў малады чалавек з пытаннем: «Жадаеце, я вам сыграю?» Ён дастаў трубу і выдаў нескладаную мелодыю. Потым працягнуў інструмент мне і не браў яго, пакуль хоць раз не атрымалася нармальна дунуць (а гэта аказалася не так проста). Мы размаўляем, і пад канец гутаркі хлопец просіць грошай «на паесці» і, задаволены, сыходзіць. Кароткая паўза. «Дарэмна я, напэўна, пра недахоп крэатыўных ідэй казаў. Хлопец, між іншым, за дзве хвіліны зарабіў на абед», — кажа Валерый Анатольевіч. І ён мае рацыю.*

■ Наўздагон

# Аўтамабіль-амфібію і «Лятучы галандзец»...

## можна было ўбачыць на Аўгустоўскім канале ў мінулыя выхадныя



**Менавіта там, каля шлюза «Дамброўка», упершыню прайшоў чэмпіянат па плаванні «на чым заўгодна» і спаборніцтвы па «балотным футболе».**

Па канале праплылі самаробныя караблі «Медыцынскі пункт» (у выкананні Гродзенскай гарадской клінічнай бальніцы №2), «Лятучы галандзец» («Гроднааблаўтатранс»). Каманда Мастоўскага райвыканкама спусціла на ваду «судна» пад назвай «Прывітанне з дзяцінства» ў выглядзе карабліка з газеты, Навагрудская ЖКГ назвала сваё «судна» «Капітан Врунгель». У арыгінальнасці і «плывучасці» з імі спаборнічаў «Чырвоны бык» Гродзенскага мясакамбіната. У незвычайным заплыве ўдзельнічалі і Чапаеў, і піраці карабель, і нават воўк з «Ну, пачакай!». А жыхар Гродна Андрэй Іўлеў, які захапляецца рэстаўрацыяй ваеннай тэхнікі, выпрабаваў плавальныя ўласцівасці аднолеслага ім аўтамабіля-амфібіі — транспарцёра на базе рухавіка аўтамабіля «Запарожац», які выпускаўся ў 1950-60-я гады. Агулам ад старту да фінішу праплылі 24 унікальныя плаўсродкі, што прадстаўлялі ўсе раёны Гродзеншчыны.

У выніку падарункі і граматы атрымалі ўсе ўдзельнікі. Гран-пры конкурсу ўзяла каманда аддзела адукацыі, спорту і турызму Гродзенскага райвыканкама. За «Лятучую тачанку» з Чапаевым, Анкай і нават канём удзельнікі атрымалі прыз — 5 млн рублёў.

У той жа дзень на канале прайшлі спаборніцтвы па «балотным футболе», у якім прынялі ўдзел 20 мужчынскіх і 4 жаночыя каманды. Арганізатары прызналіся, што, каб стварыць гразевае футбольнае поле, лужок на беразе канала разаралі трактарам і залілі вадой. Найгорш даводзілася варатарам, бо яны часцей літаральна з галавой аказваліся ў гразі. Але і прыз быў большы — 10 млн за першае месца.

**Надзея ПАЎЛАВА**



Фота БЕЛТА.

■ Факт

# КОШТ ВЕДАЎ

**Міністэрствам адукацыі зацверджаны памер платы за карыстанне школьнымі падручнікамі ў 2015/2016 навучальным годзе. Як і ў папярэднія гады, бацькі будуць аплачваць толькі 50% ад кошту падручнікаў.**

Для бацькоў першакласнікаў карыстанне камплектам падручнікаў абыдзецца ў 48 800 рублёў. Для вучняў другіх класаў — у 38 000 тысяч рублёў, трэціх класаў — 57 500 рублёў, чацвёртых — 66 000 рублёў, пятых — 74 100 рублёў, шостых — 67 000 рублёў, сёмых — 62 600 рублёў, восьмых — 70 000 рублёў, дзявятых — 100 080 рублёў, дзясятых — 92 900 рублёў і для вучняў адзінаццатых класаў — 97 900 рублёў.

У адпаведнасці з Кодэксам аб адукацыі, ад унясення платы за карыстанне падручнікамі вызваляюцца: навучэнцы санаторных школ-інтэрнатаў, спецыяльных вучэбна-выхаваўчых і спецыяльных лячэбна-выхаваўчых устаноў адукацыі; асобы з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця; дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без бацькоўскай апекі; дзеці-інваліды ва ўзросце да 18 гадоў і інваліды з дзяцінства; асобы, якія засвойваюць змест адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі, хворыя на анкалагічныя захворванні ці хворыя на туберкулёз; дзеці з сем'яў, якія ў адпаведнасці з заканадаўствам атрымліваюць дзяржаўную дапамогу на дзяцей ва ўзросце, старэйшым за 3 гады; навучэнцы з сем'яў, у якіх адзін ці абодва бацькоў з'яўляюцца інвалідамі I ці II групы, і некаторыя іншыя катэгорыі. Для навучэнцаў са шматдзетных сем'яў (трое і больш дзяцей) плата за карыстанне падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі зніжаецца на 50%.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*




белагропромбанк
традиции будущего

**Изменение в Проспект эмиссии облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» сто восьмидесятого, сто восемьдесят первого, сто восемьдесят второго выпусков**

В подпункте 2.6 пункта 2 Проспекта эмиссии облигаций открытого акционерного общества «Белагропромбанк» сто восьмидесятого, сто восемьдесят первого, сто восемьдесят второго выпусков, утвержденного решением Наблюдательного совета ОАО «Белагропромбанк» 27.06.2014, протокол № 20, слова «дата окончания периода размещения облигаций – 25.08.2015» заменить словами «дата окончания периода размещения облигаций – 21.09.2015».

Заместитель Председателя Правления ОАО «Белагропромбанк» С.П.Чугай

Заместитель главного бухгалтера ОАО «Белагропромбанк» Т.М.Толсташова

ПОЗВОНИ В СВОЙ БАНК 136
время работы Контакт-Центра Банка
8.00 - 20.00 - рабочие дни
8.00 - 18.00 - выходные и праздничные дни
Звонок со стационарного телефона, с мобильного телефона (life:), velcom, МТС) - по тарифам операторов связи.
Консультации оказываются бесплатно.

www.belapb.by

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 2 от 26 мая 2014 года, выдана Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100693551.

# ВЯРХОМ НА «ЛЕКСІЁНЕ»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Часам вельмі шкадую, што я не мастачка. Калі ўбачыла пасярод залатога акіяна «Лексіён» пад кіраваннем Уладзіміра і Алены Корсакаў, адчула, што не хапае пэндзля ў руках. Праўда, калі камбайн пад'ехаў бліжэй, ледзь не задыхнулася ад воблака пылу, якое суправаджае высачэзную машыну. І такой мініяцюрнай падалася Алена, калі яна грацыёзна саскочыла ўніз амаль з двухметровай вышыні.

— Не паверыце, але я ўсё жыццё марыла папрацаваць на жніве, — з ходу ўразіла прыгажуня. — Вось толькі нагоды не было. Спачатку сын працаваў, а потым дачка нарадзілася, не да жніва было. А цяпер добры момант прадставіўся.

Жніво — пара гарачая, нават калі справа набліжаецца да канца. Вось і Уладзімір з Аленай нецярпліва паглядаюць у бок камбайна: працаваць трэба. Гэта мне пашчасціла, што дзесьці на адвозцы затрымалася машына і ёсць некалькі вольных хвілін.

— Чаму вырашылі жонку ўзяць у памочніцы? — пытаюся ва Уладзіміра. — Хто ж вам цяпер абеды гатуе?

— Нас ніядрэнна гаспадарка корміць, — усміхаецца камбайнер. — Пакуль ёсць магчымасць, трэба сямейны бюджэт папоўніць. Жонка дапамагае па поўнай праграме. Робіць усё, што і мужчына. Памочнік жа павінен усё умець, — усміхаецца ён жонцы. — Падрыхтаваць раніцай камбайн, прадзьмуць, дэталі змазаць. Першы раз паказаў, а потым сама павінна ўсё рабіць.

Насамрэч Уладзімір жонку шкадуе, можа раней дадому адпусціць і ранішні агляд за яе зрабіць. Пакуль яна па дому ўвіхаецца і дачку ў садок збірае. У крайнім выпадку падрастае яшчэ адзін памочнік — 16-гадовы Вадзім. Цяпер ён вучыцца ў Магілёве на будаўніка, але, калі ёсць вольны час, ніколі не адмаўляецца дапамагчы. Ведае, што маці вельмі няпроста ў іх сям'і, дзе 4 мужчыны. Дачка Дамініка яшчэ зусім маленькая, сёлета 4 годзікі спаўняецца.



Працаваць памочніцай камбайнера няпроста, але Алена яшчэ і паспявае сябе глядзець. Вейкі падфарбаваны, з-пад зялёнай бейсболкі какетліва выглядваюць валасы колеру спелага жыта. Уголас зайздрошчу Аленінаму таленту заўсёды заставацца жанчынай. «Яшчэ не зусім усё паспела зрабіць, — жартуе Алена. — Накладных пазногцяў не хапае». «Манікюр тое што трэба, — смяецца ёй у тон Уладзімір. — А зверху — мазут». Разам яны крочаць па жыцці 18 гадоў, а колькі ў іх адносінах любові і пяшчоты! Сябруюць, дарэчы, са школы. Абое нарадзіліся ў Казахстане, але пасля развалу Савецкага Саюза лёс закінуў у Беларусь.

Тое, якой цаной даецца сёлетні ўраджай, відаць па іх стомленых ад пастаяннага недасыпання вачах. «Падчас жніва працоўны дзень доўгі, — прызнаецца Алена. — Калі малую некаму завесці ў садок, а трэба яшчэ прыгатаваць ежу, падымаюся а палове шостай. У полі ж драмаць нельга. Спякота была такая, што да камбайна не дакрануцца. Трэба глядзець пільна, каб пажару не выйшла».

— А што самае цяжкае?

— Усё, — прызнаецца Уладзімір. — Цяжка ў 5 раніцы падымацца, класціся спаць апоўначы. Але каму зараз у гаспадарцы лягчэй? Мы — каманда. Вынік залежыць ад ураджайнасці, ад аграномаў, ад кіраўніка гаспадаркі. Мы — у канцы спіса, наша справа — сабраць ураджай. Кіроўцам таксама цяжка. Шмат што залежыць ад іх. Будзем мы дрэнна працаваць, у іх заробку не будзе, а калі яны, то ў нас. Яны малайцы, не давалі нам сёлета прастойваць. Нягледзячы на спякоту ў кабіне. У нас хоць кандыцыянеры, а ў іх замест яго — ручнік. Сёлетняя спякота ўсіх памучыла. Вельмі напружана працавалі. Нязначнае ўзгаранне — бяда была б вялікая. Дзякуй нашым ратавальнікам, што яны побач з намі ўвесь час. Ім таксама не пазайздросціш. На вуліцы 30, а ў іх машыне пад 40. Глядзіш на іх — і захапляешся цярпеннем і мужнасцю. Калі было зусім горача, яны нават побач з камбайнам ездзілі, каб своечасова зрэагаваць.

Да камбайна набліжаецца чарговая машына, і Уладзімір бегам збіраецца з месца. Разам з Аленай глядзім, як прыгожа льецца ў кузаў залаты дождж. Некалькі хвілін — і машына зноў імчыцца на элеватар. Уладзімір махае мне рукой: падымайцеся! Ну як не скарыстацца магчымасцю праехаца на камбайне, які ўжо ўпрыгожвае 5 зорак, а 6-я збіраецца «прызямліцца». На некалькі хвілін займаю месца Алены. Трэба сачыць за жаткай, каб не трапіў выпадкова камень. Гэта таксама справа памочніка камбайнера. У кабіне гул такі, быццам ляціш у самалёце. Пра сябе думаю, што вось так амаль два месяцы з раніцы да вечара я дакладна не вытрымала б. Тут, на полі, па-сапраўднаму разумееш, што значыць бітва за ўраджай. І па-іншаму пачынаеш ставіцца да хлеба. Ён сапраўды не бывае лёгкім.

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**
*zigulya@zviazda.by*

**P.S.** *Перад тым, як развітацца, звяртаю ўвагу, што справа ад Уладзіміра на лабавым шкле вісіць ікона «Неапалімая купіна» — тая, што бароніць ад пажару. «Я веруючы чалавек, — сур'ёзна тлумачыць Уладзімір. — Тым больш што бяда мяне не абышла. Дом згарэў цалкам, усё пачынаў з нуля. І вельмі ўдзячны кіраўніку гаспадаркі, што дапамог адбудавацца. Мы тут усе — адна сям'я. Мне здаецца, што так і павінна быць».*

**Узденский райисполком 24 сентября 2015 г. в 10.00 по адресу: Минская область, г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет 418 (4-й этаж) проводит открытый аукцион по предоставлению в аренду рыболовных угодий фонда запаса Узденского района – водохранилища Лошанское общей площадью 362 га лещево-щучье-плотвичного класса в целях ведения рыболовного хозяйства путем организации платного любительского рыболовства.**

Местонахождение водохранилища Лошанское: **12 км на юго-восток от г. Узды у д. Лоша и д. Кривели Узденского района Минской области на реке Лоша.**

Аукцион будет проходить в порядке, определенном пунктом 17 Положения о порядке проведения торгов по предоставлению в аренду охотничьих угодий фонда запаса, утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30 мая 2015 г. № 451.

Минский областной исполнительный комитет в десятидневный срок со дня принятия решения заключает с победителем аукциона договор аренды рыболовных угодий на срок десять лет.

**Начальная цена объекта аукциона – 39 096 000 белорусских рублей.**

*Задаток в размере 20% начальной цены объекта аукциона составляет 7 819 200 белорусских рублей, вносится в срок* ***не позднее 22 сентября 2015 г.*** *путем безналичного расчета платежным поручением на расчетный счет Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области № 3600631002518 в ЦБУ №625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600537220, код платежа 04004.*

Участник, выигравший аукцион, в течение 10 рабочих дней со дня подписания протокола комиссии возмещает путем безналичного расчета платежным поручением на расчетный счет Главного управления Министерства финансов Республики Беларусь по Минской области №3600631002518 в ЦБУ №625 филиала №500 Минского управления ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Узда, МФО 153001601, УНП 600537220, код платежа 4616 затраты на организацию и проведение аукциона – сумму оплаты за опубликование в средстве массовой информации извещения о проводимом аукционе.

Участникам, не выигравшим аукцион, задаток возвращается в течение 5 рабочих дней после проведения аукциона.

**Адрес секретаря комиссии: г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет № 110 (1-й этаж) Узденского райисполкома, контактный телефон: 8-(01718)-65-4-37.**

Порядок предварительного ознакомления с расположением рыболовных угодий претендентами на участие в аукционе осуществляется по карте, имеющейся у секретаря комиссии в кабинете №110 Узденского райисполкома.

Для участия в аукционе юридическое лицо представляет следующие документы:

- заявление о предоставлении рыболовных угодий в аренду, в котором указываются сведения о рыболовных угодьях, которые участники аукциона желают получить по результатам торгов;
- заверенные копии учредительных документов (свидетельства о регистрации юридического лица и Устава);
- заверенная банком копия платежного поручения, подтверждающего внесение суммы задатка;
- доверенность представителя участника торгов и копия документа, подтверждающего его личность, в случае, если заявление подписывается не руководителем участника торгов, либо копия документа, подтверждающего полномочия руководителя участника торгов.

Документы для участия в аукционе принимаются в Узденском райисполкоме по адресу: **223411, г. Узда, ул. Советская, 22, кабинет №110, контактный телефон: 8-(01718)-65-4-37.**

Окончательный срок приема документов – **22 сентября 2015 г.**

■ Рыштаванні Бацькаўшчыны


Руіны манастыра па перыметры ў наш час.

## Кляштар картэзіянцаў у Бярозе спадзяецца на добрых людзей

# СУМ МАЎКЛІВАЙ ЗВАНІЦЫ


Картэзіянскі кляштар у Бярозе на гравюры Напалеона Орды.

**Да гісторыі гэтага помніка мы звярталіся ў адным з нашых чэрвеньскіх нумароў. З надзеяй — пасля таго, як з радасцю мясцовага чалавека на свае вочы ўдалося ўбачыць вынік рэстаўрацыі барочнай брамы, якая калісьці вяла ў адзін з буйных і таямнічых манастыроў XVII стагоддзя. Ён вялізным здаецца нават цяпер, калі аглядаеш рэшткі па перыметры — агромністая тэрыторыя, усё такія ж магутныя сцены, якія, здаецца, крывяць: чырвоная цэгла толькі падкрэслівае драматызм лёсу самога манастыра, які, нягледзячы на ўсе спробы вынішчыць любую памяць пра яго, усё роўна існуе, хоць бы як помнік архітэктуры. Людзі гэта ацанілі і падтрымалі, наколькі змаглі: адноўлена ўязная брама ў манастыр высілкамі самога раёна. Ёй можа пазайздросціць званіца, якая зусім побач — яны нават звязаныя з брамай кавалкам сцяны. Але адным цэлым (у вонкавым успрыманні), відаць, пакуль не стануць... Пра тое, што перашкаджае давесці справу рэстаўрацыі ўсяго манастырскага комплексу да лагічнага завяршэння (пры тым, што ёсць вялікае жаданне), мы размаўляем з супрацоўнікам аддзела ідэалагічная работы, культуры і па справах моладзі Бярозаўскага райвыканкама Вольгай ЛАЎРЭНЧУК.**

**— Калі помнік уключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны, то дзяржава павінна апекавацца ім?**

— У Бярозаўскім раёне дастаткова ўвагі надаецца падтрымцы годнага санітарнага і тэхнічнага стану нашых помнікаў, у тым ліку і кляштара. Безумоўна, нам бы хацелася правесці поўную рэстаўрацыю помніка, каб ён паўстаў у першародным выглядзе. Але гэта патрабуе вялікіх выдаткаў. У праграму «Замкі Беларусі» бярозаўскі кляштар не трапіў, але быў уключаны ў праграму «Культура Беларусі», і планавалася выдаткоўванне сродкаў з рэспубліканскага бюджэту. Аднак ні ў 2013-м, ні ў 2014 гадах фінансаванне па гэтай праграме не адбылося. Таму кіраўніцтва раёна вырашыла зрабіць хаця б частку работы: гэта было справай гонару для раёна. Але ўвесь аб'ект аднаўляць за сродкі мясцовага бюджэту было б нерэальна.

Насамрэч у нас яшчэ ў 2008 годзе быў распрацаваны праект рэстаўрацыі брамы картэзіянскага кляштара, мы да яго вярнуліся. Перадалі функцыі заказчыка раённаму УКСу (упраўленне камунальнага будаўніцтва), яны вялі ўсе работы з падраднай арганізацыяй «Брэстрэстаўрацыя». Паколькі праект быў распрацаваны даўно, спатрэбілася яго экспертыза і карэкціроўка па цэнах 2014 года. У сувязі з гэтым сума ўжо толькі на праектна-каштарысную дакументацыю была істотная. Усяго на аднаўленчыя работы райвыканкам выдаткаваў 1,5 мільярда рублёў. Старшыня Бярозаўскага райвыканкама Юрый Іосіфавіч Наркевіч адказна падышоў да вырашэння пытання рэстаўрацыі: гэтая брама — на гербе Бярозы, нельга, каб сімвал горада існаваў у выглядзе развалін.

У выніку праведзена рэстаўрацыя брамы. «Брэстрэстаўрацыя» вельмі адказна падышла да сваіх абавязкаў. Праводзіліся частыя выязныя нарады, на якія запрашаліся зацікаўленыя ў рэстаўрацыі брамы спецыялісты. Галоўны архітэктар праекта Вольга Іванаўна Нечыпурчык распрацавала цікавы і дасканалы праект, які адпавядаў гістарычнаму вобразу брамы кляштара. Напрыклад, на адваротным баку яе з унутранага боку пад дахам знарок пакінута старая тынкоўка XVII стагоддзя, на якую можна паглядзець як на узор. Гэта таксама заслуга галоўнага архітэктара.

Акрамя таго, каля брамы зроблена добраўпарадкаванне тэрыторыі: дарожку забрукавалі, зрабілі водаадвядзенне, таму што там узровень зямлі быў ніжэйшым за асноўны. Зроблены захады для таго, каб захоўваць браму ў тым выглядзе, які атрымаўся пасля рэстаўрацыі.

**— Калі раён пачаў важную справу, то, можа быць, будзе працяг? Ёсць жа праект аднаўлення ўсяго помніка, ці не так?**

— На жаль, далей работ па рэстаўрацыі пакуль не плануецца. Гэта вялікія выдаткі. У нас была мэта адрэстаўраваць браму, і праект быў толькі на яе рэстаўрацыю. Гэтыя работы мы выдатна выканалі. Пакуль у нас падтрымліваецца той стан, які ёсць. Абкошваем тэрыторыю, прыбіраем. Просім, каб не дапускалі выпадкаў вандалізму ці разбурэння рэшткаў сцен.

**— Аб'ект перспектыўны для турызму: тут жа Ружаны і Косава недалёка...**

— У Бярозаўскім раёне шмат цікавых аб'ектаў гістарычнай і культурнай спадчыны. Таму наш бярозаўскі музей распрацаваў больш за 17 турыстычных маршрутаў, якія закранаюць кожны з гэтых аб'ектаў. І картэзіянскі кляштар наведваюць як мінімум кожны чацвёрты госць нашага раёна. Справа ў тым, што кляштар сапраўды вельмі цікавы сваёй гісторыяй і архітэктурай. Ён пабудаваны паводле эскіза манастыра «Гранд Шантрэз» у Францыі, які там дзейнічае дагэтуль. І такіх няма больш нідзе ў свеце.

Манастыр пабудаваны ў прыгожым і маляўнічым месцы. Сюды часта прыходзяць гараджане і фатаграфуюцца на фоне старажытных сцен.. Картэзіянскі кляштар удзельнічае ў культурным жыцці раёна. Тут праходзяць гарадскія святы. Напрыклад, раённае свята «Дзень пісьменства», шматлікія пленэры і майстар-класы.

**— Ёсць яшчэ ў раёне помнікі, занесеныя ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурнай спадчыны?**

На тэрыторыі раёна знаходзіцца 26 помнікаў, уключаных у дзяржспіс. З іх 2 помнікі гісторыі, якія маюць рэспубліканскае значэнне. Акрамя картэзіянскага кляштара, яшчэ сядзібна-паркавы комплекс у вёсцы Пескі.

### Даведка

*Рэшткі былога кляштара картэзіянцаў у Бярозе — помнік архітэктуры XVII стагоддзя, пабудаваны ў стылі барока з элементамі абарончага характару. Кляштарны комплекс уключаў палац Сапегаў, каменны будынак касцёла, жылыя карпусы, келлі манахаў-самотнікаў, бібліятэку, шпіталь, трапезную, аптэку, аранжарэю, гаспадарчыя пабудовы, сад, вадаём. Усё было абнесена магутнай каменнай сцяной з вежамі і капліцай. Уваходам была брама з байніцамі. Пасля паўстанняў XIX стагоддзя, у якіх удзельнічалі манахі, улады Расійскай імперыі вырашылі закрыць манастыр. Частка яго пабудоў была разабраная (касцёл, келлі, адміністрацыйныя і гаспадарчыя пабудовы), цэгла з іх выкарыстоўвалася для будаўніцтва казармаў для расійскіх салдат. Да цяперашняга часу, акрамя адноўленай брамы, захаваліся рэшткі званіцы, будынку шпіталя, дома Сапегаў, дзве кутнія вежы, часткі сцен. Плошча ахоўнай зоны 7,1 гектара.*

**— Калі помнікам гісторыі нават у яго цяперашнім стане цікавяцца людзі, ці не разглядалі вы магчымасці знайсці прыватнага інвестара, які б падключыўся б да яго ратавання, няхай і маючы на ўвазе свае інтарэсы? Можа быць, ёсць неабыякавыя землякі, якія б маглі дапамагчы сваёй малой радзіме?**

— Калі б нехта зацікавіўся аб'ектам, мы б з задавальненнем перадалі яго, райвыканкам садзейнічаў бы ў вырашэнні многіх пытанняў, аказваў бы дапамогу, у тым ліку метадычную, арганізацыйную. Перспектывы там шырокія, але пры гэтым трэба разумець, што патрабуюцца вялікія ўкладанні. Аб'ект важны, каштоўны, рэспубліканскага ўзроўню. Ён мог бы прыносіць карысць і радасць.

**Ларыса ЦІМОШЫК,**
*tsimoshyk@zviazda.by*
*Бяроза — Мінск*

■ Слова краязнаўцу

# ПА СПРАВЕ ПЕРШАЙ БЕЛАРУСКАЙ ШКОЛЫ...

**Першай беларускай школай на Лідчыне стала школа ў вёсцы Збляны. У 1914 годзе ў Зблянах згарэў будынак старой навучальнай установы і яшчэ да пачатку Першай сусветнай вайны сяляне атрымалі страхоўку ды купілі будаўнічыя матэрыялы. Пры канцы 1915 года новы будынак быў узведзены, а вяскоўцы, скарыстаўшыся сваім правам, адкрылі беларускую школу, якая існавала тут да сярэдзіны 1920-х гадоў.**

У 1923 годзе дзейнасць найстарэйшай на Лідчыне беларускай школы ў Зблянах была прыпынена. *«Усе нашыя людзі былі рады, што дзеці неяк шыбка навучаліся і чытаць, і арытмэтыкі. Але хутка здарылася няшчасьце: нашага вучыцеля інспэктар Лідскага павету, пан Вайтовіч прымусіў паехаць на польскія курсы ў Кракаў, а другога вучыцеля-беларуса на яго месца не прызначыў, і замёрла наша беларуская школа»* — 13 чэрвеня 1923 года пісалі сяляне ў беларускую газету «Наш Сьцяг» (арфаграфія і пунктуацыя тут і далей захоўваюцца).

Вясной 1925 года жыхары вёскі Збляны падпісалі да павятовага школьнага інспектара дэкларацыю за беларускую школу, а потым нягледзячы на ціск, дружна патрабавалі свайго. Тады ўлады вырашылі перанесці будынак зблянскай школы ў Беліцу. Сяляне, высілкамі якіх гэта школа будавалася, пісалі пратэсты ў Міністэрства асветы і да мясцовых улад. Аднак адказу не атрымалі. У лютым 1926 года *«ад староства прыехалі тэхнікі ўжо разьбіраць гэты будынак. На дамаганьне кіраўнікоў разбору, каб сяляне далі рабочых і падводы, усе жыхары вёскі Збляны катэгарычна адмовіліся і на сходзе вырашылі зрабіць яшчэ адпаведныя крокі, каб ўратаваць з такім трудом збудаваную іхнімі рукамі для сваіх дзетак школу, для чаго праз дэлегацыю зьвярнуліся да Пасольскага Клюбу Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады аб атрыманьні іх дамаганьняў»* — пісала газета *«Беларуская Ніва»*.

Па справе школы дэлегацыя зблянскіх сялян спецыяльна сустрэлася ў Вільні з беларускім паслом у Сейм Сымонам Рак-Міхайлоўскім, які якраз у гэты час лячыўся ў Вільні. Рак-Міхайлоўскі не мог асабіста выехаць у Варшаву, таму 17 студзеня 1926 года даслаў тэлеграмы ў Міністэрствы асветы і ўнутраных спраў такога зместу: *«Назначаны праз Лідзскага Старасту супраць волі гміннай рады войт Беліцкай гміны Вадэйка пад намовамі ксяндза з фальварку Няцеча проці волі ўсяе люднасьці пераносіць з дазволу Старасты школьны будынак, збудаваны мяйсцовай люднасьцю з вёскі Збляны да мястэчка Беліца Лідзкага павету. Пратэстуючы проці бясправўя і пагвалчаньня правоў беларускай люднасьці, прашу аб безадкладным затрыманні разборкі будынку да часу належнага вырашэння гэтае справы паводле скаргі сялян вёскі Збляны, перасланай Беларускім Клюбам да Міністэрства Асьветы ў красавіку леташняга году.*

*Рак-Міхайлоўскі, дэпутат».*

Аднак абараніць сваю школу беларускія сяляне не змаглі.

Першая беларуская школа адкрыта 13 лістапада 1915 года ў Вільні на Юр'еўскай вуліцы дзякуючы намаганням Алаізы Пашкевіч (Цёткі) і Баляслава Пачобкі. І таму па ўсёй Заходняй Беларусі беларуская грамадскасць святкавала 10-ю гадавіну існавання беларускай школы.

А мы хутка можам святкаваць 100-гадовы юбілей першай афіцыйнай беларускай школы на Лідчыне.

**Леанід ЛАЎРЭШ**

■ Рупліўцы спадчыны

# ПАМЯЦЬ БЯЛЫНІЧ

## Ці пацвердзіцца існаванне і захаванне старых каталіцкіх могілак, залежыць ад археалагічнай экспертызы

**У мінулую пятніцу ў Бялынічах распачаліся археалагічныя раскопкі на месцы верагоднага будаўніцтва крамы. Яны прадоўжацца 10 дзён і менавіта ад іх выніку залежыць, быць тут старым каталіцкім могілкам ці новай краме...**

Раскопкі вырашана было правесці пасля таго, як некаторыя бялынічане, даведаўшыся пра пачатак будаўніцтва новай крамы, прыгадалі, што на гэтым самым месцы калісьці знаходзіліся каталіцкія могілкі. Пра гэта сведчыць, напрыклад, стары надмагільны камень, які знаходзіцца на тэрыторыі: на ім па-польску напісана, што тут пахавана нейкая Адэля з дваімі дзецьмі, і пазначана дата пахавання — 1853 год. Таксама і мясцовыя жыхары прыгадваюць, што тут былі капліца і склепы, а самі могілкі ў народзе называліся каталіцкімі, або «польскімі».

Можна сказаць, што «справа могілак» цягнецца ўжо больш за стагоддзе. У 1907 годзе яны былі закрыты (магчыма, з-за перапоўненасці), пару дзесяцігоддзяў не эксплуатаваліся. А ў пасляваенны час іх тэрыторыю цалкам зраўнавалі: надмагільныя камяні, верагодна, проста ссунулі экскаватарамі. На месцы могілак узвялі гаспадарчыя пабудовы, гаражы — яны, дарэчы, знаходзіліся тут да апошняга часу.

**Супрацоўнік Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Аляксандр ВАШАНАЎ**, які цяпер працуе на раскопках, адзначае, што капаць яны пачалі толькі нядаўна, але ўжо атрымалі некаторыя вынікі:

— Мы адшукалі каля сямі пахаванняў: відаць сляды магільных ям, косці. Храналагічна пакуль цяжка вызначыць, да якога часу яны адносяцца. Знойдзены шкляны гузік з выявай якара — не выключана, што гэта канец XVIII стагоддзя. Да таго ж мы зрабілі фотаздымак аднаго склепа, які добра відаць. Мясцовыя жыхары сведчаць, што раней такіх склепаў тут было некалькі шэрагаў. І той надмагільны камень, які дайшоў да нашага часу, наўрад ці быў адзіным. Мажліва, калі тэрыторыя раўнавалася, камяні проста ссоўвалі ў склепы і засыпалі. Калі ўдасца іх адшукаць, гэта дасць нам дадатковую інфармацыю.



Карты, на якіх адзначаны старыя каталіцкія могілкі.

Акрамя артэфактаў, гісторыкі маюць яшчэ і тапаграфічныя карты 2-й паловы XIX і пачатку XX стагоддзяў, на якіх адзначаны гэтыя могілкі.

**Начальнік аддзела ідэалагічнай працы, культуры і па справах моладзі Бялыніцкага райвыканкама Ірына ФУРСАВА** адзначыла:

— Згодна з заканадаўствам, канчатковае рашэнне пра далейшы лёс гэтага месца будзе прымаць раённы Савет дэпутатаў. Усё будзе залежаць ад вынікаў археалагічных раскопак. Днямі мы сустракаліся для грамадскага абмеркавання з жыхарамі раёна — сабраліся на скрыжаванні, акурат блізу месца будаўніцтва. Я ўпэўнілася, што сітуацыя спакойная, жыхары не супраць, каб знойдзеныя астанкі былі перапахаваны на тых могілках, якія дзейнічаюць цяпер. Дарэчы, магільны камень знаходзіцца па-за зонай меркаванага будаўніцтва. Таму ён у любым выпадку застанецца на ранейшым месцы, а тэрыторыя вакол яго будзе добраўпарадкаваная.

Тыя ж, хто выступае за тое, каб могілкі захаваліся, зауважаюць, што ў Бялынічах, якія маюць досыць цікавую гісторыю, сведчанняў сівой даўніны, на жаль, і так амаль няма. Напрыклад, былы кармеліцкі манастыр другой паловы XVIII стагоддзя быў узарваны і разабраны ў 1970-я гады. На сённяшні дзень ёсць толькі пару будынкаў канца XIX — пачатку XX стагоддзяў, аднак і яны не маюць статусу гісторыка-культурных каштоўнасцяў. Таму так важна ўратаваць хаця б гэтыя старыя могілкі. **Магістр гістарычных навук, настаўнік адной з мясцовых школ Яўген ДУДКІН**, адзначае:

— Чаму настолькі важная для мяне як гісторыка і верніка гэтая справа захавання годнасці каталіцкіх пахаванняў?.. За савецкім часам, палітыкай ваяўнічага камунізму вынішчалася хрысціянская вера — фундамент беларускай дзяржаўнасці, светапогляд нашага народа апошняга тысячагоддзя, з якім звязаны яго дасягненні. Да таго ж Бялыніччына — гэта Дняпроўскае Палессе: жыццё тут ідзе спакойна, забыты яго героі, пра якіх хадзілі легенды і паданні па ўсіх беларускіх землях. Чаго толькі варты абраз Маці Божай Бялыніцкай, які ўпершыню ў Рэчы Паспалітай быў каранаваны папскімі каронамі — раней, чым вядомы абраз у Чэнстахове. Сюды прыходзілі тысячы пілігрымаў з межаў былога Вялікага Княства — як каталікі, так і праваслаўныя... Таму і сёння важна на прыкладзе беларускай гісторыі і гэтых могілак паказаць узроснюю міжканфесійную талерантнасць і павагу, захаваць месца сустрэчы і ўзбагачэння хрысціянскіх канфесій.


Рэшткі склепа — колішняга шляхецкага пахавання.

Да таго моманту, калі канчаткова будзе вырашаны лёс «спрэчнай тэрыторыі», засталося зусім няшмат часу. Усе кропкі над «і» расставяць вынікі археалагічных даследаванняў. А мяне як журналіста здзіўляе толькі адзін факт: чаму пра нашы каштоўнасці, пра занядбаныя месцы памяці мы часта ўзгадваем толькі тады, калі ўжо, мажліва, позна, калі знаходзіцца ўласнік, які па-свойму жадае распарадзіцца новай маёмасцю? Чаму так мала звяртаем увагі на закінутыя, непатрэбныя зусім нікому аб'екты, якія, аднак, захавалі дух ранейшых часоў?.. Калі на месцы старых могілак былі гаспадарчыя пабудовы і гаражы, нікога яны быццам не хвалявалі. І калі б яны папросту зараслі бур'яном, ці сталі б мы іх так актыўна ратаваць?..

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ,**
*nina@zviazda.by*

■ Калекцыя

# У ПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА...

**Біблейскі радок стаў назвай выставы Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі, што прысвечана ўвасабленню Новага Запавету ў абразах, скульптуры, кніжнай гравюры, літургічным адзенні.**

Выставу пабудавалі згодна з тэкстам Новага Запавету: мастацкія творы ў храналагічным парадку паказваюць падзеі ад Дабравешчання да Апакаліпсісу. Некаторыя рарытэты набывалі ў калекцыянераў, а большасць вярталі з нябыту падчас экспедыцый, што ладзіліся музейшчыкамі на ўсёй тэрыторыі Беларусі ў 80-я — пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя.

— У гэты час многія храмы былі зачыненыя, а культавыя прадметы, што захоўваліся недзе ў падвалах, на гарышчах і практычна не выкарыстоўваліся, перадаваліся музею. Калі распачаўся працэс адраджэння царквы, частку твораў мы ёй вярнулі, а нешта ў нас засталося. Напрыклад, некаторыя абразы XVII-XVIII стагоддзя зараз у царкве лічацца некананічнымі, але тым не менш, гэта помнікі беларускай культуры. Імі трэба ганарыцца, — кажа арганізатар выставы, **старшы навуковы супрацоўнік Гродзенскага дзяржаўнага музея гісторыі рэлігіі Сяргей КАЗУЛЯ.**


Сяргей Казуля: «Трэба ведаць і развіваць нашы мастацкія традыцыі».

Многія з твораў дзякуючы гродзенскаму **мастаку-рэстаўратару Уладзіміру КІСЛАМУ** атрымалі другое жыццё. Большасць экспанатаў паходзіць з Гродзеншчыны і Брэстчыны, з праваслаўных, каталіцкіх і уніяцкіх храмаў. Пры гэтым можна ўбачыць, што ў XVII — пачатку XIX стагоддзя ў Беларусі існавала свая іканапісная школа, якая спалучала ўсходнія і заходнія традыцыі праваслаўя і каталіцызму. Гэтым яна адрозніваецца ад мастацкіх традыцый суседніх краін.

Вось, напрыклад, абраз «Маці Божая беззаганная з выбранымі святымі» (канец XVIII — пачатак XIX ст.). Маці Божая стаіць на маладзіку, а вакол яе дванаццаць зорак. Чаму такая назва? У каталіцкай і ўніяцкай царкве існуе дагмат пра бязгрэшнае зачацце, недзе ў XVI стагоддзі яго сталі паказваць у выяве дзевы, якая апісваецца ў Апакаліпсісе. На алтары лілея — сімвал бязгрэшнасці. Адзін анёл трымае карону, другі — скіпетр як сімвалы каранавання Маці Божай. Цэнтральны сюжэт абраза ўзяты з каталіцкага жывапісу, разам з тым заўважна і чыста праваслаўная традыцыя ўвасаблення розных святых — тут і апостал Пётр з ключамі ад пекла і раю, і Павел з мячом у руках, і іншыя святыя.

— Сёння, калі ўмацоўваецца дзяржава і развіваецца беларуская культура, трэба памятаць свае карані. Мы, музейшчыкі, робім свой унёсак у гэтую справу — стараемся, каб людзі бачылі асаблівасці нашага мастацтва ў даўніне — узаемапранікненне ўсходняга і заходняга стыляў, — лічыць Сяргей Казуля.

Выстава будзе працаваць да лістапада.

**Барыс ПРАКОПЧЫК,**
*prakopchik@zviazda.by*
**Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА**



**Найстарэйшы экспанат выставы — «Евангелле», якое было выдадзена ў 1644 годзе ў Еўі, непадалёк ад Вільні, у брацкай праваслаўнай друкарні. Яно лічыцца адной з самых багата арнаментаваных кніг увогуле за перыяд брацкага кнігадрукавання. Многія гравюры паходзяць яшчэ з часоў Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца.**

■ Педсавет

# ЦІ МОГУЦЬ ПАДРУЧНІКІ БЫЦЬ ІДЭАЛЬНЫМІ?

## І ЦІ ПРЫСЛУХОЎВАЮЦЦА ІХ СТВАРАЛЬНІКІ ДА МЕРКАВАННЯ БАЦЬКОЎ ШКОЛЬНІКАЎ

**Школьныя падручнікі выклікаюць шмат пытанняў у вучняў, бацькоў і настаўнікаў. Іх абвінавачваюць у празмерным акадэмізме, падчас складанай для школьнікаў тэрміналогіі, адсутнасці міжпрадметных сувязяў... Нездавальняючую падрыхтоўку выпускнікоў па дакладных навуках многія таксама звязваюць з якасцю школьных падручнікаў. Педагогі са стажам прыгадваюць з настальгіяй савецкія падручнікі і прапануюць перагледзець іх змест, каб паспрабаваць адаптаваць да патрэбаў сучаснай школы. А ці магчыма ўвогуле стварыць школьны падручнік, які задаволіць усіх: і настаўнікаў, і вучняў, і іх бацькоў? Якім павінен быць падручнік новага пакалення? Чым парадуюць вучняў у новым навучальным годзе стваральнікі вучэбнай літаратуры? Каб атрымаць адказы на гэтыя пытанні, мы накіраваліся ў Нацыянальны інстытут адукацыі.**

### А МОЖА, ЛЕПШ ЯКАСНЫ?

— Даволі часта ў паняцце «якасны падручнік» укладваюць крыху іншы сэнс — «ідэальны падручнік». Я лічу, што падручнік павінен быць не ідэальным, а сучасным і адпавядаць патрэбам сённяшняга і заўтрашняга дня, — дзеліцца сваімі думкамі **начальнік метадычнага цэнтра інстытута Рыгор ЧАМАДАНАЎ.** — Ідэальнасць — статычная рэч, а ўмовы вакол нас пастаянна змяняюцца, змяняюцца сучасныя дзеці, развіваецца навука, у тым ліку педагагічная, удасканальваюцца навучальныя тэхналогіі... Грамадства прад'яўляе новыя патрабаванні да навучання і выхавання школьнікаў. Усё гэта пры стварэнні падручнікаў трэба ўлічваць. Не варта забывацца пра тое, што беларускі падручнік — зусім малады. У нас змянілася ўсяго тры яго пакаленні (прайшло тры перавыданні). А ў савецкія часы дасканальным лічыўся падручнік, які перавыдаваўся не менш як 10 разоў. Гэта, заўважу, сказалі навукоўцы Акадэміі навук, а не я. З кожным чарговым перавыданнем падручнікі ўдасканальваліся і шліфаваліся. Таму ўсе з павагай прыгадваюць падручнік па фізіцы Пёрышкіна, па гісторыі — Кароўкіна і гэтак далей. Сапраўды, пакуль што некаторыя з нашых падручнікаў яшчэ недасканалыя, але іх змест значна палепшыўся: паміж першым і трэцім выданнем — вялікая розніца! Першыя падручнікі, якія вымушана ствараліся ў вельмі сціслыя тэрміны, былі больш падобна на навуковыя трактаты, чым на кнігі для школьнікаў. Пры перавыданні падручніка абавязкова ўлічваецца меркаванне педагагічнай грамадскасці... Напрыклад, у аснову стварэння новых падручнікаў па замежных мовах быў пакладзены камунікатыўны падыход, паколькі ставілася канкрэтная мэта — кожны выпускнік павінен валодаць гутарковай замежнай мовай і свабодна кантактаваць з носьбітамі іншых моў хаця б на бытавым узроўні.

### КОНКУРС — ПА НОВЫХ УМОВАХ

Па словах **намесніка дырэктара Нацыянальнага інстытута адукацыі па навукова-даследчай рабоце, доктара педагагічных навук Людмілы ХУДЗЕНКІ,** падрыхтоўка і стварэнне сучасных падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў для агульнаадукацыйных устаноў — шматбаковы і творчы працэс, у якім удзельнічаюць вучоныя, метадысты, настаўнікі, выдаўцы і паліграфісты. Галоўная роля ў гэтым працэсе, несумненна, адводзіцца аўтарам ці аўтарскім калектывам. Для павышэння якасці нацыянальных падручнікаў іх трэцяе пакаленне стваралася ўжо на конкурснай аснове. З 2008 па 2012 год быў праведзены конкурс па стварэнні падручнікаў па ўсіх прадметах.

— З улікам атрыманага досведу мы вырашылі перагледзець умовы правядзення конкурсу, — расказвае Людміла Худзенка. — Мяркуецца, што на конкурс трэба будзе прадставіць канцэпцыю падручніка і адзін з найбольш складаных яго раздзелаў. А раней трэба было напісаць увесь падручнік, выдаткаваць на гэта, магчыма, некалькі гадоў свайго жыцця, а потым давядзецца, што праца была марная: перамог падручнік тваіх канкурэнтаў. Пры такім падыходзе было не шмат ахвотных удзельнічаць у конкурсе... Цяпер пад увагу будзе брацца бачанне будучага падручніка аўтарскім калектывам, яго канцэпцыя, таксама будзе ацэньвацца і шэраг іншых параметраў, напрыклад узровень складанасці выкладання матэрыялу, ілюстрацыйны матэрыял, адпаведнасць узроставым асаблівасцям школьнікаў, адукацыйным стандартам і вучэбным праграмам, сучаснаму стану развіцця навукі, паслядоўнасць і пераемнасць зместу пры пераходзе з класа ў клас, унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі. У аснову стварэння новых падручнікаў закладваюцца практыкаарыентаванасць у выкладанні матэрыялу і рэалізацыя кампетэнтаснага падыходу.

Немалаважная акалічнасць — захаванне канфідэнцыяльнасці. Ніхто не будзе ведаць аўтараў падручніка да заканчэння конкурсу. Імёны рэцэнзентаў да абвяшчэння вынікаў агучвацца таксама не будуць, каб цалкам выключыць суб'ектыўнасць пры ацэньванні.



Ірына Васільева: «На нацыянальным адукацыйным партале прадстаўлена ўжо каля 200 электронных навучальных курсаў».

### ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

**У 2015/2016 навучальным годзе ў адукацыйным працэсе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі будзе выкарыстоўвацца 499 найменняў падручнікаў і навучальных дапаможнікаў. З іх 249 — ва ўстановах з беларускай мовай навучання і 250 — з рускай. Да новага навучальнага года перавыдадзена 103 найменні падручнікаў і навучальных дапаможнікаў. Сярод навучальных выданняў ёсць і навінкі. Гэта навучальныя дапаможнікі па кітайскай мове для 10 класа, па нямецкай і французскай мовах — для 7 класа гімназій, па англійскай — для 11 класа гімназій. Таксама выдадзена 14 найменняў навучальных дапаможнікаў, выкананых на аснове рэльефна-кропкавай сістэмы Брайля, для дзяцей з парушэннем зроку. Падрыхтаваны працоўны сшытак для пяцікласнікаў па новым прадмеце — «Мастацтва. Айчынная і сусветная мастацкая культура».**

### АНКЕТА ДЛЯ БАЦЬКОЎ

Як адзначае Рыгор Чамаданаў, звычайна ў аўтарскі калектыў уваходзіць не менш як тры чалавекі. Як правіла, гэта вучоныя (паколькі навуковы складнік падручніка вельмі важны), метадысты і педагогі-практыкі, якія знаёмы як з метадычным апаратам, так і з адукацыйнай праграмай.

Натуральна, што кожны падручнік абавязкова праходзіць доследную праверку, да якой прыцягваюцца як вучоныя, спецыялісты Акадэміі паслядыпломнай адукацыі і інстытутаў развіцця адукацыі, так і школьныя настаўнікі. І, калі падчас апрабацыі падручніка высвятляецца, што дзеці не разумеюць вучэбны матэрыял, што настаўніку цяжка растлумачыць вучням нейкую тэму, падручнік адпраўляецца на дапрацоўку...

У межах доследнай праверкі вучэбных выданняў праводзіцца таксама анкетаванне бацькоў. Анкета, якую ім прапануецца запоўніць, змяшчае наступныя пытанні: «Ці зразумела для вашага дзіцяці выкладзены вучэбны матэрыял у падручніку (ці даступна сфармулявана вызначэнне паняццяў, законаў і прынцыпаў, дадзена іх тлумачэнне)?», «Ці можа ваш сын (дачка), вывучыўшы вучэбны матэрыял, самастойна адказаць на пытанні, якія даюцца ў канцы параграфа?», «Ці мае месца вучэбная перагрузка пры рабоце з падручнікам?». Бацькам прапануецца таксама адзначыць нумары параграфаў і назвы тэм, тэарэтычны матэрыял якіх выклікаў у дзіцяці цяжкасці.

Не ўсе падручнікі выклікаюць незадаволенасць бацькоў. Напрыклад, падручнікам «Хімія» за сёмы клас засталіся незадаволены толькі 2% з іх. Амаль усе бацькі канстатавалі, што дзеці рэдка звяртаюцца да іх па дапамогу менавіта пры падрыхтоўцы хатніх заданняў па хіміі. Ніводнага параграфа (тэмы), тэарэтычны матэрыял якіх выклікаў бы ў сямікласнікаў цяжкасці, не было адзначана. Невыпадкова падручнік «Хімія. 7 клас» быў высока ацэнены і настаўнікамі-экспертамі, якія адзначылі поўную яго адпаведнасць дыдактычным прынцыпам даступнасці і нагляднасці.

Увогуле, думкі бацькоў найчасцей за ўсё супадаюць з ацэнкай вучэбнага выдання педагогамі. Вынікі анкетавання ўважліва аналізуюцца спецыялістамі інстытута і знаходзяць адлюстраванне ў аналітычных запісках па выніках доследнай праверкі.

З 2011 года на сайце Нацыянальнага інстытута адукацыі дзейнічае форум «Якасць школьных падручнікаў». Меркавалася, што новая рубрыка стане своеасаблівым анлайн-каналам для экспертызы падручнікаў, дзе свае думкі і заўвагі зможа выказаць кожны. Як сведчыць аналіз водгукаў на форуме, заўвагі, што паступаюць на сайт, тычацца пераважна аб'ёмнасці асобных параграфаў у падручніках, складанасці выкладання вучэбнага матэрыялу і якасці ілюстрацыйнага матэрыялу. Шэраг заўваг тычыцца таксама якасці перакладу на беларускую мову вучэбнага матэрыялу па матэматыцы, біялогіі, гісторыі, фізіцы і інфарматыцы. У Нацыянальным інстытуце адукацыі запэўніваюць, што ўсе слушныя заўвагі і прапановы, зробленыя наведвальнікамі форуму, даводзяцца да ведама аўтараў. Ім перадаюцца і лісты, што паступаюць у Нацыянальны інстытут адукацыі ад грамадзян, якіх хвалюе якасць айчыннай вучэбнай кнігі.

### ЯШЧЭ БОЛЬШ ДАСТУПНАСЦІ

З 1 верасня ў 10 класе пачне масава ўкараняцца профільнае навучанне. Якімі падручнікамі будуць забяспечвацца дзесяцікласнікі?

— Пры пераходзе ў 2008 годзе на 11-гадовы тэрмін навучання быў прыняты адзін узровень засваення зместу адукацыі — базавы. У такой сітуацыі стварыць падручнік, які задаволіў бы ўсіх без выключэння вучняў, было праблематычна, — тлумачыць Людміла Худзенка. — З аднаго боку, ён павінен быў утрымліваць поўны набор базавых ведаў, змест і мова выкладання падручніка павінны былі быць даступнымі абсалютнай большасці вучняў, а з іншага — даваць магчымасць высокаматываваным навучэнцам для больш паглыбленага вывучэння прадмета. Увядзенне профільнага навучання дазволіць нам дыферэнцыраваць змест навучання. Зараз мы працуем над канцэпцыяй базавага падручніка, які будзе ўключаць мінімальна неабходны аб'ём тэарэтычнага і практычнага матэрыялу, а таксама ўтрымліваць электронныя дадаткі. У нас ёсць магчымасць зрабіць гэты падручнік яшчэ больш даступным.

Паралельна ў Нацыянальным інстытуце адукацыі рэалізуецца навукова-даследчы праект па стварэнні электроннага падручніка-навігатара па хіміі для 10 класа.

— Падручнік-навігатар пашырае магчымасці класічнага вучэбнага забеспячэння. Яго прынцыпова новая якасць заключаецца ў тым, што ён закліканы выконваць функцыю навігацыі па ўсіх кампанентах вучэбна-метадычнага комплексу. Гіпертэкставая арганізацыя матэрыялу дазваляе хутка перайсці да неабходнага раздзела, параграфа, слоўніка або тэставых заданняў. Пры неабходнасці можна выйсці па спасылцы на рэсурс аддаленага доступу, напрыклад на сайт або партал, дзе размешчаны іншыя кампаненты вучэбна-метадычнага комплексу (хрэстаматыі, даведнікі, іншы дадатковы матэрыял), — расказала **начальнік адукацыйнага цэнтра інстытута, кандыдат філалагічных навук Ірына ШАЎЛЯКОВА-БАРЗЕНКА.** — У адрозненне ад вучэбнага выдання на папяровай аснове падручніку-навігатару ўласцівы такія функцыі, як мультымедыйнасць, інтэрактыўнасць, наяўнасць зваротнай сувязі (рэакцыя з боку электроннага падручніка на дзеянні навучэнца ў выглядзе каментарыя, дапамогі ці падказкі), магчымасць выбудоўвання індывідуальнай адукацыйнай траекторыі. Адметнасцю будзе арыгінальны вучэбны мэдыякантэнт: педагогі з Ліцэя БДУ спецыяльна для новага падручніка запісваюць міні-фільмы з дэманстрацыяй хімічных вопытаў. У ідэале падручнік-навігатар павінен быць такім, каб яго можна было выкарыстоўваць на розных тыпах электронных прылад — ад інтэрактыўнай дошкі да планшэта і смартфона.

**Не ўсе падручнікі выклікаюць незадаволенасць бацькоў. Напрыклад, падручнікам «Хімія» за сёмы клас засталіся незадаволены толькі 2% з іх. Амаль усе бацькі канстатавалі, што дзеці рэдка звяртаюцца да іх па дапамогу менавіта пры падрыхтоўцы хатніх заданняў па хіміі.**

### ...І ЛІТАРАТУРА «ПАД МУЗЫКУ»

Між іншым, сёння на нацыянальным адукацыйным партале (www.adu.by) прадстаўлена ўжо каля 200 электронных навучальных курсаў, створаных у Нацыянальным інстытуце адукацыі па ўсіх вучэбных прадметах з 1 па 11 клас.

Па словах **начальніка ўпраўлення інфармацыйных адукацыйных тэхналогій Ірыны ВАСІЛЬЕВАЙ,** кожны з курсаў уключае тры буйныя модулі. Даведачна-інфармацыйны, напрыклад, змяшчае разнастайныя мультымедыйныя рэсурсы, слоўнікі, хрэстаматыі і іншага кшталту даведачную інфармацыю. Кантрольна-дыягнастычны модуль прадстаўлены рознымі трэнажорамі, практыкумамі, апытальнікамі, задачнікамі, тэставымі заданнямі, а інтэрактыўны — віртуальнымі навучальнымі лабараторыямі, рознымі дыдактычнымі гульнямі, камп'ютарнымі мадэлямі, якія дазваляюць візуалізаваць вывучаемыя аб'екты. Напрыклад, пры вывучэнні матэматыкі настаўнік можа выкарыстоўваць інтэрактыўны модуль з дэманстрацыяй дынамічных мадэляў. Іх можна круціць, паказваць у лепшым ракурсе, мяняць маштаб, задаваць неабходныя параметры ў адпаведнасці з умовай задачы. Настаўнік можа загадзя спампаваць мадэль на флэшку, калі ў школьнай аўдыторыі няма доступу ў інтэрнэт, прынесці на ўрок і з дапамогай камп'ютара і праектара выкарыстаць электронны рэсурс пры тлумачэнні новай тэмы.

Ці ўзяць беларускую літаратуру. Здавалася б, ні на ўроках літаратуры можна выкарыстоўваць электронныя сродкі навучання? «Вельмі проста», — адказваюць супрацоўнікі інстытута і адкрываюць раздзел «Беларуская літаратура. 8 клас». Пры знаёмстве з творчасцю Максіма Багдановіча, у прыватнасці з яго вершам «Зорка Венера», прадугледжана знаёмства школьнікаў з такім тэарэтычным паняццем, як раманс. Рэсурс пабудаваны так, што спачатку васьмікласнікам прапануецца вызначэнне гэтага тэрміна ў літаратуразнаўстве, а затым даецца магчымасць супаставіць гэта паняцце з тым, як яно прадстаўлена ў іншых відах мастацтва, напрыклад у музыцы. Раманс можна на ўроку праслухаць. Гэта дазваляе школьнікам лепш зразумець сутнасць раманса як жанру.

На партале размешчаны таксама электронныя варыянты школьных падручнікаў у PDF-фармаце. Электронная копія папяровага падручніка можа аказацца карыснай у тых выпадках, калі пад рукой няма друкаванага варыянту. Можна скачаць падручнік на сваю электронную прыладу і заўсёды мець яго пад рукой. Ацэняць гэту магчымасць і выпускнікі пры падрыхтоўцы да вусных і ўступных іспытаў.

### НА ПАВЫШАНЫМ УЗРОЎНІ

А цяпер што тычыцца профільных класаў. Для вывучэння прадметаў на павышаным узроўні на партале выкладзена шмат электронных адукацыйных рэсурсаў. Усе яны знаходзяцца ў свабодным доступе. Скажам, калі нейкая тэма ў профільным класе вывучаецца на павышаным узроўні, то ў дапамогу педагогам на партале прадстаўлена ўся неабходная дадатковая інфармацыя. Пакуль што там выстаўлена інфармацыя, якая спатрэбіцца настаўнікам у першай вучэбнай чвэрці. Але паступова гэтая база будзе папаўняцца.

**Надзея НІКАЛАЕВА. Фота аўтара.**

*nikalaeva@zviazda.by*

Сумесны выпуск газеты «Звязда» і Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя №3

# ЧЫСЦІНЯ НАВАКОЛЛЯ ПАЧЫНАЕЦЦА З ЧЫСЦІНІ ДУШЫ

## Як супрацоўніцтва Мінпрыроды і Беларускай Праваслаўнай Царквы дапамагае вырашаць экалагічныя праблемы

**Чарговае пасяджэнне каардынацыйнага савета па распрацоўцы і рэалізацыі сумесных праграм супрацоўніцтва паміж органамі дзяржаўнага кіравання і Беларускай Праваслаўнай Царквой адбылося днямі ў Бярэзінскім біясферным запаведніку. Пад шатамі запаведных дрэў удзельнікі сустрэчы абмеркавалі ход выканання праграмы супрацоўніцтва Мінпрыроды і БПЦ па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя.**

Па словах **міністра прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэя КАЎХУТЫ**, дзякуючы свайму аўтарытэту Беларуская Праваслаўная Царква аказвае вялікі ўплыў на фарміраванне грамадскай думкі, дапамагае ўсвядоміць, што мэта жыцця — не ў максімальным спажыванні, а ў духоўным удасканаленні. «Калі мы займаемся экалогіяй прыроды, мы ачышчаем душу», — адзначыў міністр.

— Сёння на прыкладзе БПЦ як самай масавай канфесіі ў галіне аховы прыроды вучацца працаваць іншыя канфесіі і рэлігійныя напрамкі (а іх налічваецца 25 у краіне), многія выпрацоўваюць свае цікавыя падыходы, — адзначыў **упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцяў, старшыня каардынацыйнага савета Леанід ГУЛЯКА**.

Сёння Мінпрыроды і Беларуская Праваслаўная Царква працуюць па некалькіх асноўных кірунках аховы навакольнага асяроддзя.

Штогод у значныя экалагічныя і рэлігійныя даты, Дзень малітвы аб Божым тварэнні, угодкі чарнобыльскай катастрофы, Дзень аховы навакольнага асяроддзя і іншыя праходзяць сумесныя мерапрыемствы і малебны.

У розных рэлігійных арганізацыях і храмах Беларусі сёння займаюцца асветай і выхаваннем грамадзян у духу беражлівага стаўлення да навакольнага асяроддзя. Напрыклад, у



Падчас сустрэчы Андрэй КАЎХУТА і Мітрапаліт Павел узнагародзілі пераможцаў конкурсу на найлепшы профіль у сацыяльных сетках праекта ЕС і ПРААН «Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да «зялёнай» эканомікі».



Дзяржаву і царкву аб'яднала... экалагічная сцежка.

Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

Гродзенскай епархіі дзейнічае адзіны ў краіне экалагічны цэнтр, які пры падтрымцы абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя праводзіць маладзёжныя экалагічныя злёты, мерапрыемствы ў галіне ўстойлівага развіцця.

Многія храмы і прыходы не толькі выхоўваюць экалагічна дасведчаных грамадзян, але і спрабуюць вырашаць лакальныя экалагічныя праблемы. Яшчэ да старту шырокай кампаніі па зборы батарэек у многіх рэлігійных установах краіны пачалі збіраць элементы сілкавання, займаюцца тут і добраўпарадкаваннем крыніц пітной вады.

У брацкім доме «Кінанія» пры падтрымцы экалагічных арганізацый створаны экалагічны клас, дзе праводзяцца майстар-класы, экалагічныя семінары для дзяцей, у тым ліку і з абмежаванымі магчымасцямі.

Па словах каардынатара праектаў аб'яднання «Жывое партнёрства» Ларысы Якавюк, фарміраванне экалагічнага ладу жыцця ў прыхаджан — адна з галоўных надзённых задач. Сёння неабходна ва ўсіх прыходах, храмах гаварыць пра тое, што на святы могілкі не павінны ператварацца ў царства «пластыкавай прыгажосці». Бо павага да продкаў — гэта не толькі догляд магіл, але і жывыя, а не штучныя, кветкі.

Вопыт рэлігійных устаноў і арганізацый, прадстаўлены падчас пасяджэння, магчыма, ляжа ў аснову новай праграмы супрацоўніцтва Мінпрыроды і БПЦ па пытаннях аховы навакольнага асяроддзя на перыяд 2016-2020 гг., праект якой плануецца падрыхтаваць да лістапада бягучага года. У хуткім часе павінен з'явіцца і рабочы план сумеснай экалагічнай дзейнасці на 2016 год. Многія мерапрыемствы, якія ўвойдуць у гэты дакумент, будуць прысвечаны 30-годдзю Чарнобыльскай катастрофы.

— Мы будзем рабіць усё магчымае, каб людзі, асабліва маладое пакаленне, выхоўваліся ў духу любові, беражлівага стаўлення да навакольнага асяроддзя, — адзначыў **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Павел, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі**. — Навучыцца жыць у чысціні і парадку можна толькі знутры. Экалогія павінна стаць ладам жыцця.

**Вераніка КОЛАСАВА.** *kolasava@zviazda.by*

# СПЫНІЦЬ НАШЭСЦЕ «ЧУЖЫНЦАЎ»

## Чым небяспечныя для флоры і фаўны інвазіўныя віды?

**Каларадскі жук і янотападобны сабака, баршчэўнік Сасноўскага і чырвоны дуб — гэтыя і многія іншыя прадстаўнікі жывёльнага і расліннага свету з'яўляюцца экзатычнымі, нетыповымі для нашай мясцовасці. У кожнага з іх — асабісты шлях міграцыі, але збліжае іх адно — небяспека, якую яны нясуць людзям і беларускай прыродзе ўвогуле.**

Паводле слоў загадчыка лабараторыі гідрабіялогіі НПЦ па біярэсурсах НАН Беларусі, кіраўніка міжведамаснага цэнтра па інвазіўных відах Віталя Сяменчанкі, у многіх краінах Еўропы і рэгіёнах Расіі існуюць так званыя «чорныя спісы». Туды ўключаны віды жывёл і раслін, здольных



прынесці істотную эканамічную, экалагічную і сацыяльную шкоду краіне. У канцы года павінна ўбачыць свет і беларуская «Чорная кніга». У гэтым выданні навукоўцы даступнай мовай раскажуць пра тую небяспеку, якую нясуць чужародныя віды, і падкажуць, як з імі можна змагацца.

Сёння ў папярэдні спіс уваходзяць 54 віды раслін, 3 віды рыб, адзін від рэптылій, 3(2) віды млекакормячых, 7 відаў водных і 25 наземных беспазваночных. Самыя вядомыя з іх — баршчэўнік Сасноўскага, сумнік канадскі, эхінацысціс шыпаваты («шалёны агурок»), амерыканская норка, янотападобны сабака, ратан-галавешка, каларадскі жук і інш. У «Чорную кнігу» не ўключаліся віды, якія адсочваюцца каранціннай і фітасанітарнай інспекцыямі, таму што кантроль за імі ўжо вядзецца. Але мяркуецца, што частка небяспечных відаў будзе рэкамендавана ўключыць і ў каранцінныя спісы.

На думку навукоўцаў, існуе тры асноўныя прычыны, якія ўплываюць на ўзмацненне працэсу інвазіі. Першая — гэта развіццё гаспадарчай дзейнасці чалавека, у тым ліку павелічэнне транспартных плыняў і тавараабмену. На другім месцы — глабальныя змены клімату. Трэцяя прычына — гадоўля ў хатніх умовах экзатычных відаў раслін і жывёл.

— Мы не можам згарнуць усю гаспадарчую дзейнасць, спыніць зносіны паміж дзяржавамі і нават забараніць людзям вырошчваць на сваіх участках незвычайныя расліны, — кажа Віталь Сяменчанка. — Але кожны павінен усведамляць небяспеку, якую ўяўляюць інвазіўныя віды для нашай прыроды, і, па магчымасці, яе прадухіляць.

Так, пажоўклае лісце на каштане — «справа рук» інвазійнай каштанавай молі. Папулярныя ў насельніцтва расліны сумнік канадскі і шалёны агурок, якія добра прыстасаваліся да



нашых умоў, таксама наносяць шкоду прыродзе, займаючы ўсё большыя тэрыторыі.

Новы карантынны і чужародны від — амброзія плоскакаласковая — вельмі моцны алерген, здольны нашкодзіць 80% людзей, схільных да алергічных рэакцый. Наогул, інвазіўныя расліны і жывёлы валодаюць настолькі шырокай устойлівасцю да розных фактараў навакольнага асяроддзя, што дазваляе ім пацясніць абарыгенныя віды. Тым больш калі ім дапамагае сам чалавек.

— Людзі, што займаюцца інтрадукцыяй раслін і жывёл, часта ацэньваюць сваю дзейнасць толькі з эканамічнага пункту гледжання, не пралічваючы магчымыя экалагічныя наступствы, — лічыць навуковец. — Яркі прыклад таму — сітуацыя з завезенай для гадоўлі амерыканскай норкай, якая два гады назад цалкам выцесніла родную для нас еўрапейскую норку.

Часта бездакназнасць да сваіх дзеянняў выяўляюць і тыя, хто заводзіць экзатычную жывёлу, а праз нейкі час вырашае пазбавіцца ад сваёй «цацкі», выпусціўшы яе ў навакольнае асяроддзе.

Каб барацьба з небяспечнымі відамі жывёл і раслін была эфектыўнай, самае важнае — не ўпусціць час, упэўнены навукоўцы. Таму трэба выразна адсочваць сітуацыю на мяжы і ў сумежных краінах. Бо жывёла, якая пракралася ў Польшчу ці Расію, неў-



Фота Дзяніса ІЎКОВІЧА.

забаве трапіць і да нас. І трэба быць гатовымі хутка адбіць гэты «напад».

Сёння ў Беларусі распрацоўваюцца і дзейнічаюць спецыяльныя праграмы па барацьбе з інвазіўнымі відамі. Навукоўцы працуюць над стварэннем біярацыянальных пестыцыдаў, здольных без вялікай шкоды для людзей і прыроды знішчыць небяспечныя расліны. Вялікую ролю ў рашэнні гэтай праблемы адыгрывае супрацоўніцтва і абмен інфармацыяй з сумежнымі краінамі.

— Дзякуючы гэтаму мы можам адсачыць прасоўванне відаў, папярэдзіць іх з'яўленне на нашай тэрыторыі і знайсці найбольш эфектыўныя спосабы барацьбы з «чужаземцамі», — лічыць Віталь Сяменчанка. — Да таго ж звесткі замежных калег дапамагаюць нам ацаніць патэнцыйную шкоднасць віду, які пакуль з-за невялікай колькасці ў нашай краіне не праяўляе сябе на поўную сілу.

**Вераніка КОЛАСАВА.** *kolasava@zviazda.by*

**Ніколі не выпускайце экзатычных жывёл у натуральнае асяроддзе! Гэта сур'ёзнае парушэнне прыродаахоўнага заканадаўства. Да таго ж наступствы вашага неабдуманага кроку могуць быць катастрафічнымі для прыроды.**

**Перш чым пасадзіць у сябе незвычайную расліну, пацікаўцеся, наколькі гэты від можа быць небяспечным. Кансультацыю можна атрымаць у НПЦ па біярэсурсах і ў Інстытуце эксперыментальнай батанікі НАН Беларусі.**

Андрэй КАЎХУТА:

# «ЗАБРУДЖВАЮЧЫ СЁННЯ ВАДУ СУР'ЁЗНЫЯ ПРАБЛЕМЫ

**Як хутка ў Беларусі з'явіцца завод па перапрацоўцы батарэек? Ці плануецца павялічыць памер штрафаў за прычыненне шкоды наваколлю? Як паўплывалі пажары ў чарнобыльскай зоне на радыяцыйнае становішча ў краіне? Наколькі Беларусь здольная забяспечыць сябе энергетычнымі рэсурсамі? На гэтыя і іншыя пытанні чытачоў «Звязды» адказаў міністр прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Андрэй Каўхута падчас «прамой лініі», што адбылася ў рэдакцыі газеты «Звязда».**




Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

## ПЛАНЫ ДЛЯ АДХОДАЎ

***— Нядаўна даведалася, што ўпакоўкі Tetra Pack нельга выкідаць у кантэйнеры з макулатурай. Ці з'явяцца для іх спецыяльныя кантэйнеры? Магчыма, у Беларусі існуюць тэхналогіі для перапрацоўкі такой упакоўкі? Таксама мяне цікавіць, ці плануецца ўстанавіць кантэйнеры для харчовых адходаў.***

— У Беларусі пакуль не існуе тэхналогіі па перапрацоўцы тэтрапакаў. Я лічу, што ўсе другасныя адходы павінны перапрацоўвацца, на палігоны мусяць трапляць толькі тыя рэчывы, якія не паддаюцца гэтай працэдуры. Дарэчы, Мінпрыроды нясе адказнасць за тое, каб палігоны не забіваліся смеццем, якому можна даць другое жыццё.

Трэба адзначыць, што зараз мы працуем над пытаннем перапрацоўкі ўсіх відаў адходаў. Калі ў вас няма кантэйнераў для збору другасная сыравіны, калі ласка, звяртайцеся да мясцовых жыллёва-камунальных гаспадарак і вырашайце з імі гэтае пытанне.

Што датычыцца кантэйнераў для харчовых адходаў, то пакуль іх ставіць не плануем. На абмеркаванне з Мінархітэктуры вынесена прапанова мантажу прылад па здрабненні харчовых адходаў у кухонных сістэмах каналізацыі. Падобная мадэрнізацыя дазволіць скараціць паступленне харчовых адходаў сумесна з іншымі.

***— Дзе захоўваюцца сабраныя батарэйкі? Куды яны накіроўваюцца, і як хутка ў Беларусі з'явіцца завод па іх перапрацоўцы?***

— На жаль, сёння батарэйкі ў нашай краіне таксама не перапрацоўваюцца. З гэтай мэтай яны ў нас збіраюцца і вывозяцца за мяжу. Існуе сістэма збору і ўтылізацыі элементаў сілкавання, якая дзейнічае на многіх прадпрыемствах і кантралюецца камунальнымі службамі ды Мінпрыроды. На сумеснай калегіі з Мінжылкамгасам мы разглядалі пытанне пра тое, каб асвоіць тэхналогію перапрацоўкі батарэек непасрэдна на прадпрыемствах. Мяркуем, што ў найбліжэйшы час гэта пачне здзяйсняцца. Магчыма, вы заўважалі, што ў супермаркетах з'явіліся кантэйнеры для збору батарэек — гэта сведчыць пра тое, што сістэма збору паступова наладжваецца. Таксама міністэрствам разглядаюцца пытанні аб стварэнні прадпрыемстваў па комплекснай перапрацоўцы адходаў.



***— Тэлефаную з Салігорска. Пасля здабычы калійных угнаенняў тут утварыліся вялікія горы адходаў. Скажыце, ці плануецца з імі нешта рабіць?***

— Сапраўды, праблема абыходжання з буйнатанажнымі адходамі вытворчасці, у тым ліку галітавымі адходамі, у нас існуе, бо такога «смецця» збіраецца вельмі шмат. Адходы, якія назапашваюцца ў выніку дзейнасці адкрытага акцыянернага таварыства «Беларуськалій», займаюць вялікую тэрыторыю. Акрамя таго, рыхтуюцца іншыя пляцоўкі для іх размяшчэння. Аднак спецыялісты імкнуцца мінімізаваць негатыўныя наступствы, якія з'яўляюцца з-за такога «смецця», напрыклад, засаленне тэрыторыі. Для вырашэння праблемы распрацоўваюцца планы па ўтылізацыі адходаў. Апошнія часткова выкарыстоўваюцца для стварэння фрыкцыйных супрацьгалалёдных сумесяў, якімі зімой пасыпаюць дарогі. Часткова адходы перапрацоўваюцца. Навукоўцы працуюць над прапановамі — якія тэхналогіі дапамогуць перапрацаваць гэта «смецце». Існуе сістэма загрузкі такіх адходаў у шахты, але гэта вельмі дарагое мерапрыемства.

***— Больш за дваццаць гадоў займаюся перапрацоўкай адходаў. Хачу задаць пытанне: раней у рэспубліцы дзяржаўным аб'яднаннем «Белрэсурсы» праводзілася выстава, прысвечаная перапрацоўцы адходаў. На кожны з відаў было прадстаўлена па некалькі патэнтаў. Раней тыя ж батарэйкі як матэрыялы, узбагачаныя рудой, здавалі на металургічныя заводы і г.д. Як іх цяпер выкарыстоўваць? Ці ёсць магчымасць аднавіць выстаўку?***

— Праблема абыходжання з адходамі — шматпланавая і міжведамасная, датычыцца не толькі Мінпрыроды, але і міністэрстваў гандлю, жыллёва-камунальнай гаспадаркі, прамысловасці, аховы здароўя, сельскай гаспадаркі і харчавання. Ваша прапанова вельмі добрая. Мяркую, што мы ўзгаднім гэтае пытанне з іншымі ведамствамі. Дарэчы, на сёлетнім экалагічным форуме мы прадстаўлялі інфармацыю пра перапрацоўку адходаў. Усе ахвотныя маглі прыняць у ім удзел.

***— Падкажыце, куды ў Мінску я магу здаць адпрацаваныя энергазберагальныя лямпачкі? Раней прымалі пажарныя часці, цяпер адмаўляюцца. Што рабіць?***

— Цяпер ёсць прыёмныя пункты ў буйных гандлёвых сетках, напрыклад, кампанія «ОМА», гіпермаркет «Прастор». Азнаёміцца з пунктамі збору адпрацаваных лямпачак можна на сайце «Зялёная карта» (greenmap.by).

## ЧЫСЦІНЯ ПАВІННА БЫЦЬ УСЮДЫ: І Ў ПАВЕТРЫ, І ПАД ЗЯМЛЁЙ

***— Якім чынам пажары ў чарнобыльскай зоне паўплывалі на радыяцыйнае становішча ў краіне?***

— Сітуацыя кантралюецца спецыялістамі гідраметэаралагічнай службы. Пакуль перавышэнняў за межамі зоны не выяўлена. Аднак у краіне адзначаны перавышэнні па цвёрдых часцінках у паветры. Сітуацыя зразумелая: ветры, спёка, адсутнасць ападкаў. Небяспекі для здароўя няма. Палепшыць становішча можна наступным чынам: рабіць паветра больш вільготным пры дапамозе палівальных машын, што дапамае знізіць канцэнтрацыю пылу. Распрацоўваюцца рэкамендацыі, каб мясцовыя камунальныя службы прымалі захады дзеля прывядзення паказчыкаў у норму. Нашы спецыялісты ў сваю чаргу адсочваюць, каб яны выконваліся. Вы ведаеце, што зараз устаноўлены забароны на наведванне лясоў — гэта робіцца для таго, каб выключыць магчымасць узнікнення пажару. У большасці выпадкаў бедства здараецца з прычыны неасцярожнага стаўлення чалавека да наваколля.

***— Мяне вельмі ўразілі нядаўнія рэпартажы ў «Звяздзе» пра тое, што ў нас закопваюць старыя фермы, пабудовы ды звалкі — і ўсё гэта адбываецца ў гаспадарках літаральна на палях. Чаму Мінпрыроды так спакойна рэагуе на гэтыя выпадкі? Чаму не дзейнічае больш жорстка? Адходы атручваюць глебу, ваду і, як вынік, наша здароўе...***

— У заканадаўстве аб ахове наваколля сказана, што пры будаўніцтве не павінна быць нанесена шкоды наваколлю. Пры зносе мусіць выконвацца заканадаўства ў галіне абыходжання з адходамі, аховы наваколля і атмасфернага паветра, вады. Вядома, што будынкі сельскагаспадарчага значэння складаюцца з металалому, драўніны, канструкцый, якія можна выкарыстоўваць. Добры гаспадар знойдзе паўторнае прымяненне для металалому альбо здасць яго і атрымае за гэта грошы. Тое ж датычыцца і драўніны. Што да сценавых канструкцый, то іх таксама можна перапрацаваць. Па нашых падліках, каля 90% фермы можна паўторна выкарыстоўваць. Але практыка паказвае, што часам людзі ўсе гэтыя каштоўныя матэрыялы, то бок рэсурсы, папросту закопваюць у зямлю. За падобныя парушэнні прадугледжана даволі жорсткая адміністрацыйная і крымінальная адказнасць, штрафы перавышаюць тысячу базавых велічынь.

***— Свіслач называюць адной з самых забруджаных рэк Беларусі. Чаму так адбываецца? Якія меры прымаюцца па ачыстцы гэтага вадаёма?***

— Сапраўды, Свіслач лічыцца адной з найбольш забруджаных рэк Беларусі на працягу многіх гадоў. Сёння 14 прадпрыемстваў скідваюць у яе сцёкавыя воды. Але па даных маніторынгу, на працягу сямі месяцаў гэтага года ў вадзе ў межах горада Мінска не назіралася перавышэнняў па асноўных забруджвальніках (арганічныя і біягенныя рэчывы). Адзначу, што для зніжэння забруджвання Свіслачы пастаянна распрацоўваюцца і праводзяцца комплексныя мерапрыемствы. Так, летась



■ Прамая лінія

# І ГЛЕБУ, МЫ ЗАЎТРА СТВОРЫМ ДЛЯ СЯБЕ І НАШЧАДКАЎ»

для паляпшэння экалагічнага становішча ў раку падсялілі шчупака, таўсталобіка, белага амура, карася.

***— У Еўропе і Амерыцы за любыя дзеянні, якія наносяць шкоду прыродзе, прадугледжаны вялікія штрафы. Напрыклад, у Канадзе, калі выкінеш з машыны недакурак, заплаціш штраф у памеры 500 долараў. У нас жа штрафы за больш істотныя парушэнні складаюць ад сілы адзін мільён рублёў. Ці плануецца павялічыць іх памер?***

— У нас таксама ёсць сістэма аховы прыроды, прадугледжваюцца штрафы, у тым ліку за выкідванне недакурка з машыны. Міліцыя адсочвае такія выпадкі, фатаграфуе. Нашы супрацоўнікі робяць захады для таго, каб такога не здаралася. Але, на жаль, негатыўных выпадкаў пакуль хапае.

Што датычыцца штрафаў, то ў нас яны вызначаюцца ў адпаведнасці з базавымі велічынямі: калі апошнія павялічваюцца, дык яны таксама растуць. Думаю, не ўсе людзі пагодзяцца, што мільён рублёў — невялікая сума для штрафу. Акрамя штрафаў парушальнікі аплачваюць шкоду, нанесеную прыродзе.





## ПРЫРОДА НЕ ЦЕРПІЦЬ УМЯШАННЯ

***— Я жыву ў Мінску непадалёк ад берага Свіслачы і ўвесь час назіраю, як людзі кормяць качак, вавёрак і іншую жыўнасць у дзіцячым парку імя Горкага чым папала, напрыклад, батонамі. Мы думаем, што робім добрую справу, калі падкормліваем крылатых. Але насамрэч мы іх ледзь не забіваем сваёй «дабрынёй». Я ведаю, што ў некаторых краінах Еўропы прадугледжаны спецыяльныя пункты для кармлення дзікіх звяроў і птушак, дзе можна купіць неабходны і, галоўнае, бяспечны для іх корм. Ці прадугледжваецца ў нас развіццё такіх пунктаў?***

— Сапраўды, у нашых гарадах жыве шмат птушак і жывёл. І вы маеце рацыю, што людзям трэба ведаць, чым карміць дзікіх жывёл. Зразумела, да кожнага чалавека інспектара не прыставіш. Трэба папулярна растлумачваць гэтыя пытанні, весці інфармацыйную работу. Мы падумаем над тым, як гэта можна ажыццявіць у вялікіх парках. Будзем прымаць меры, каб гэтую праблему вырашыць.

***— Сёлета каля пасёлка Мачулішчы назіраю плантацыі баршчэўніка Сасноўскага. Каторы год змагаемся з гэтым злом, але, відавочна, непаспяхова. Што трэба рабіць для вырашэння праблемы?***

— Хачу заўважыць, што, акрамя баршчэўніка, ёсць яшчэ адна агрэсіўная расліна — сумнік канадскі, які даволі хутка займае цэлыя палі. А самы эфектыўны метад барацьбы з баршчэўнікам — прымяненне гербіцыдаў з наступнай апрацоўкай глебы. У чэрвені-ліпені трэба праводзіць рэгулярнае скошванне расліны і іншыя агратэхнічныя мерапрыемствы. Таксама ў законе «Аб раслінным свеце» сказана, што самі землекарыстальнікі нясуць адказнасць за распаўсюджванне інвазіўных відаў. Калі яны не праводзяць мерапрыемствы па барацьбе з небяспечнай раслінай, мы накладваем на іх штрафы. Па кожным землекарыстальніку складаюцца планы, дзе прапісана, якімі сродкамі і калі трэба змагацца з баршчавіком. Нашы службы гэта кантралююць. Адзначу, што ў Гродзенскай вобласці сістэма наладжана і барацьба вядзецца паспяхова. А вось на Віцебшчыне, на жаль, недапрацоўваюць. Дзіўна, аднак так атрымліваецца, што пакуль на людзей не накладуць штрафы, яны самі не пачнуць займацца вырашэннем гэтага пытання.

***— Хацелася б даведацца, чаму скарачаецца плошча поле- і лесаахоўных палос — хіба гэта не наносіць шкоду глебам?***

— Сапраўды, адсутнасць ахоўных лесапалос прыводзіць да зніжэння банітэту (якасці) глебы, адбываецца выдзіманне пасеваў збожжавых і траў, і ў выніку атрымліваем нашмат меншы ўраджай. Акрамя таго, у культурах, якія вырошчваюцца, павышаецца колькасць забруджвальных рэчываў, у тым ліку цяжкіх металаў. Яшчэ тры гады таму грамадзяне пачалі актыўна звяртацца ў Мінпрыроды па пытанні масавай высечкі зялёных насаджэнняў каля дарог. Падчас даследавання праблемы выявілася, што неабгрунтаванае высяканне праводзіцца пад відам навядзення парадку на зямлі.

Каб палепшыць сітуацыю, Мінпрыроды распрацавала комплекс даходаў па ўдасканаленні работ па навядзенні парадку на зямлі і добраўпарадкаванні тэрыторый населеных пунктаў, улічваючы мерапрыемствы па захаванні і аднаўленні зялёных насаджэнняў, зацверджаных у 2012 годзе. Акрамя таго, спецыялістамі Інстытута лесу НАН Беларусі распрацаваны рэкамендацыі па стварэнні (рэканструкцыі) поле- і лесаахоўных лесапалос. Летась уздоўж аўтамабільных дарог былі створаны зялёныя насаджэнні на плошчы 35,4 км².

## ЗА ЎЗНАЎЛЯЛЬНЫМІ РЭСУРСАМІ — НЕБЛАГАЯ БУДУЧЫНЯ

***— Ці можа Беларусь цалкам забяспечыць сябе энергетычнымі рэсурсамі?***

— Наша краіна мае запасы нафты, спадарожнага газу, торфу. Ёсць радовішчы бурага вугалю, гаручых сланцаў, але пакуль што распрацоўка іх тэхналагічна і эканамічна немэтазгодная. Па меры змяншэння на планеце карысных выкапняў любыя рэсурсы становяцца патрэбнымі. Рэаліі наступныя: пашыраюцца напрамкі эканамічнай дзейнасці ў Беларусі, нафтаперапрацоўчыя заводы маюць вялікія магутнасці і не толькі абслугоўваюць патрэбы краіны, але і экспартныя пастаўкі. Уласныя энергетычныя патрэбы сваімі сродкамі мы пакуль не забяспечваем. Даўно пастаўлена задача максімальна выкарыстоўваць прыродныя рэсурсы. Гэта і трэскі — біялагічныя віды паліва, і альтэрнатыўныя крыніцы энергіі: вецер, сонца, вада. Выкарыстанне апошніх павялічваецца — у іх ёсць неблагая перспектыва. Вядзецца ў краіне і пошук радовішчаў нафты, спадарожнага і прыроднага газу.

***— Ці плануецца сёлета прадставіць шырокай грамадскасці нацыянальны даклад пра стан навакольнага асяроддзя ў нашай краіне?***

— Гэты дакумент Мінпрыроды рыхтуе адзін раз на пяць гадоў. Зараз вядзецца актыўная праца па падрыхтоўцы нацыянальнага даклада за перыяд 2010—2014 гадоў. Ён ужо ўзгоднены з іншымі органамі дзяржаўнага кіравання і праўстаўлены на абмеркаванне грамадскасці. Тэкст размешчаны на афіцыйным сайце Мінпрыроды www.minpriroda.gov.by. Вы можаце азнаёміцца з ім, а калі ў вас будуць нейкія заўвагі ці прапановы, пакінуць іх на сайце. Яны будуць улічаны пры падрыхтоўцы канчатковай рэдакцыі нацыянальнага дакладу. Дакумент будзе прадстаўлены на канферэнцыі міністраў аховы навакольля еўрапейскіх краін «Наваколле для Еўропы» ў 2016 годзе, якая адбудзецца ў Грузіі.

***— Прачытаў у інтэрнэце, што Альманскія балоты — самы вялікі балотны комплекс у Еўропе — забруджаны радыяцыяй яшчэ з сярэдзіны мінулага стагоддзя. Ці праўда гэта? І ці адкрыты доступ для турыстаў на гэтую тэрыторыю?***

— Адзначу, што Альманскія балоты адносяцца да ляснога фонду, іх землекарыстальнікамі з'яўляюцца Столінскі і Палескі лясгасы. У Столінскім лягсасе сапраўды адзначаны такія плямы, дзе ёсць перавышэнні па радыенуклідах. Уся астатняя тэрыторыя не мае перавышэнняў, яна актыўна выкарыстоўваецца ў турызме, на ёй распрацоўваюцца экалагічныя маршруты. Даволі даўно тут дзейнічаюць прыродаахоўныя ўстановы «Сярэдняя Прыпяць» і «Альманскія балоты». Тэрыторыю рэспубліканскіх заказнікаў раю наведваць з гідам, які добра ведае гісторыю гэтых мясцін. Дарэчы, нядаўна Прэзідэнт прыняў рашэнне, згодна з якім госці з-за мяжы мусяць плаціць за наведванне Альманскіх балот.

***— Вядомы факт, што вы свабодна размаўляеце па-беларуску і нават чыталі на роднай мове лекцыі па структурнай геалогіі. Ці будзеце і далей выкарыстоўваць яе (магчыма, на нарадах у міністэрстве)? Ці ёсць такая практыка?***

— Безумоўна, як іншыя жыхары нашай краіны, мову ведаю і люблю. Сапраўды, чытаў лекцыі па структурнай геалогіі і геатэктоніцы. Зараз назіраем такую сітуацыю — ва ўніверсітэтах шмат замежных студэнтаў, якія вучацца разам з нашымі. Выкарыстоўваецца ў асноўным руская мова, каб інфармацыю разумелі ўсе. На беларускай мове пішам загады, якія ўносім на разгляд у Адміністрацыю Прэзідэнта. Мова шырока выкарыстоўваецца ў справаводстве, думаю, і на нарадах у міністэрстве будзем размаўляць па-беларуску.

**Кацярына РАДЗЮК.**
*radziuk@zviazda.by*
**Вераніка КОЛАСАВА.**
*kolasava@zviazda.by*
**Фотаздымкі Анатоля КЛЕШЧУКА**



■ Друкуецца ў «Роднай прыродзе»

# ГРАДКІ Ў ЦЭНТРЫ ГОРАДА



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Памідоры ў кадках растуць добра.

**Першы гарадскі грамадскі агародчык быў закладзены ў цэнтры сталіцы сёлета ў маі. Схаваны ў дворыку ля плошчы Перамогі па суседстве з аўтамыйкай і гаражамі, ён выглядае нібыта аазіс сярод каменных джунгляў. Сёння тут цябе сустракаюць драўляныя скрыні і мяшкі, дзе набіраюцца колерам памідоры ды пузатыя гарбузы, спеюць духмяныя суніцы. Што гэта: экзотыка, эксперымент ці модны экалагічны праект? За гутаркай «мама» праекта, выпускніца «Школы экалагічнага актывіста» Юлія КАШАПАВА паспявае паліць усіх «зялёных жыхароў» агарода.**



Агарод Тэмпельхоф з'явіўся на месцы былога аэрадрома.

Дзяўчына паставіла перад сабой мэту стварыць такое месца для людзей, куды кожны можа прыйсці, папрацаваць, навучыцца асновам арганічнай сельскай гаспадаркі. На яе думку, грамадскі агародчык — цудоўнае рашэнне для гараджан, у якіх няма лецішча. Кожны можа ўнесці свой невялікі ўклад: паліць грады, падвязаць памідоры альбо расфарбаваць сцены ці ўпрыгожыць альтанку. Гарадскія сады і агароды даўно сталі прывычнай з'явай у еўрапейскіх гарадах. Юлю натхніў прыклад Берліна.

— Я была на агародзе Тэмпельхоф, які зроблены на месцы былога аэрадрома, — распавядае яна. — Гэта свабодная прастора, дзе кожны займаецца тым, чым хоча, і не плаціць за гэта грошы. Але ёсць той жа «Сад прынцэс» (яшчэ адзін гарадскі агарод у сталіцы Германіі), які працуе наступным чынам: таварыства арандуе закінутую гарадскую тэрыторыю і разбівае там сад ці агарод. Зацікаўленыя жыхары займаюць за грошы месца і вырошчваюць на ім агародніну ці садавіну. Ураджай гарадскія фермеры пакідаюць сабе.

Юля прызнаецца, што на агародзе бывае раз у тыдзень: «Мы проста далі яму старт, калі разбілі градкі. Усе культуры растуць самі па сабе, мы амаль не ўмешваемся ў іх развіццё, хіба што паліваем, падвязваем».

Мабільныя кадушачныя градкі зроблены па законах арганічнай сельскай гаспадаркі. Па-першае, яны шматслойныя: у самым нізе выкарыстоўваецца галлё, якое ўтрымлівае вільгаць. Потым засыпаецца сухое лісце і трава. На другі слой кладзецца парваная папера — яна ўтрымлівае ў сабе вільгаць. Пасля трэба насыпаць зямлі з кампостам і гноем, а ў завяршэнне дабавіць «прысыпку» з мульчы — саломы ці лісця. Мульчыраваны слой перашкаджае хуткаму перасыханню зямлі: салома ўбірае ў сябе шмат вільгаці, і такім чынам глеба заўжды застаецца вільготнай. Дзякуючы мульчы ў слаях, блізкіх да глебы, пачынаюць развівацца мікраарганізмы: чарвякі, жукі, якія насычаюць глебу патрэбнымі мікраэлементамі. На зіму градкі накрываюць саломай і пакінуць адпачываць да вясны, пасля зноў засадзяць. Такіх градак хопіць на чатыры гады. Найбольш пладароднымі яны стануць праз год-два.



Гарадскія агароды папулярныя ў Еўропе.

Арганічнае ўгнаенне для агарода пастаўляюць чырвоныя каліфарнійскія чарвякі, якія жывуць у драўлянай скрыні. Гэта даволі непераборлівыя істоты, якія баяцца хіба што нізкіх тэмператур. Родзічы ўсім вядомых дажджавых чарвякоў харчуюцца арганічнымі адходамі і ператвараюць іх у каштоўнае арганічнае ўгнаенне — капраліты. Юля заўважыла: пакета з арганікай ім хапае на тыдзень. Сама дзяўчына — прыхільніца раздзельнага збору адходаў. Юля паўплывала і на сваякоў: падарыла маме каліфарнійскіх чарвякоў, а тая пачала сартаваць адходы і чакае салому для мульчыравання градак.

Наступны «сакрэт» гарадскіх градак — правільнае суседства раслін. З гэтым Юлі дапамагала пермакультурны дызайнер Аліна Пашэк. Адны расліны могуць стаць удалымі партнёрамі для іншых: яны ўзбагачаюць глебу мікраэлементамі, патрэбнымі «суседзям». Вядома, што морква добра ўжываецца з памідорамі, шалфеем, салатай, цыбуляй, бобам, але не зможа прымірыцца з кропам. Агуркам не падабаюцца вострыя травы, затое побач з прадстаўнікамі бабовых яны растуць лепей.

Эксперыментальны арганічны агарод дае цікавыя вынікі: у цені ўсё расце нашмат лепш, чым на сонцы, хаця першапачаткова дзяўчаты планавалі засадзіць толькі сонечны бок. Цікаўлюся, якая культура аказалася самай капрызнай. Дрэнна прыжыўся сонцалюбівы сланечнік, які, нібыта пацвярджаючы словы Юлі, панік галавой. А памідоры не прыносяць клопатаў і добра растуць нават без спецыяльных цяпліц.

— Сваім прыкладам я хацела б сказаць людзям, што перасоўныя градкі можна смела выкарыстоўваць у двары ці на дзіцячай пляцоўцы, — кажа гарадская фермерка. — У эстонскіх гарадах вялікія гарбузы ў кадках можна сустрэць паўсюль. А што перашкаджае нам стварыць такую прыгажосць?

Дарэчы, першы ўраджай з агародчыка ўжо даўно з'едзены — зяленіна хутка знікла з градак. На падыходзе морква. Асноўны ўраджай сабяруць па восені, і тады можна будзе падвесці вынікі незвычайнага праекта.

**Кацярына РАДЗЮК.** *radziuk@zviazda.by*

**Першыя гарадскія агароды і сады пачалі з'яўляцца ў Германіі яшчэ 150 гадоў таму. Урач з Лейпцыга Морыц Шрэбер заклікаў людзей азеляняць гарады, што дапамагло б узмацніць здароўе дзяцей. Сёння нямецкія фермеры збіраюцца ў саюзы, а рух urban gardening — гэта найлепшы адпачынак, які дазваляе працаваць на зямлі, трымаць сябе ў выдатнай фізічнай форме і харчавацца экалагічна чыстымі прадуктамі.**


**Чытайце ў жнівеньскім нумары часопіса**

**«РОДНАЯ ПРЫРОДА»:**

**— Ці ўтульна страусам на беларускай зямлі?**

**— Чаму НАСА праводзіць выпрабаванне марсаходаў у Антарктыдзе?**

**— Як зрабіць ваду гаючай, падкажуць нашы продкі.**

**— Амарант — пустазелле, якое выратуе чалавецтва.**

**— Кошкі таксама пудраць носік: выбіраем аксесуары для хатняга пестуна.**





■ Далёкае-блізкае

# ХОЧАШ ДАПАМАГЧЫ ПРЫРОДЗЕ? ДАЛУЧАЙСЯ!

**У Беларусі пачаў сваю дзейнасць Міжнародны фонд падтрымкі дзікай прыроды «Чырвоны бор», місія якога заключаецца ў аб'яднанні высілкаў па вывучэнні і ахове дзікай прыроды Беларусі. Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі дырэктар арганізацыі Сяргей ПЛЫТКЕВІЧ. Доўгі час інфармацыя пра фонд была вядомая толькі ў вузкім коле спецыялістаў: хоць ён быў зарэгістраваны сёлета 24 лютага, афіцыйная прэзентацыя адбылася толькі на мінулым тыдні.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Многія арганізацыі сумесна з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь ўжо праводзілі ўдалыя прыродаахоўныя акцыі і кампаніі, — адзначыў **намеснік міністра Мінпрыроды, старшыня апякунскага савета фонду Ігар КАЧАНОЎСКІ.** — Мы бачым, што людзі зацікаўлены ў захаванні дзікай прыроды, але іх прапановы збольшага хаатычныя. Таму мы падхапілі ідэю аб стварэнні спецыяльнага фонду: цікавыя праекты змогуць прыцягнуць і людзей, і фінансы. Мы спадзяёмся, што ён дасць падтрымку для правядзення мерапрыемстваў, на якія часам не хапае сродкаў у бюджэце краіны.

Кожны ахвотны можа далучыцца да праектаў у якасці спонсара, партнёра альбо валанцёра. Фонд прыме любую дапамогу: фінансавую, інфармацыйную.

У якасці прыярытэту новая арганізацыя называла падтрымку маладых вучоных. Першы праект фонду «Вывучаем Чырвоны бор» пацвярджае гэтыя словы: летась у снежні быў аб'яўлены конкурс навуковых праектаў. З 12 заяўленых прац 6 былі зацверджаны і атрымалі фінансаванне фонду. Па выніках праведзеных даследаванняў будзе апублікавана брашура з прадстаўленымі праектамі. Акрамя таго, фонд будзе аказваць дапамогу маладым вучоным, фінансаваць іх удзел у міжнародных канферэнцыях.

Важнасць падтрымкі навукоўцаў падкрэсліў **дырэктар дзяржаўнага навукова-вытворчага аб'яднання «Навукова-практычны цэнтр НАН Беларусі па біярэсурсах» Алег БАРАДЗІН.**

— Аднаўленне і вывучэнне дзікай прыроды мусяць мець навуковую абгрунтаванасць. Інакш наступствы могуць быць непрадказальнымі. Праекты, прапанаваныя маладымі вучонымі, зацікавілі спецыялістаў. У будучыні гэтыя напрацоўкі могуць стаць сур'ёзнымі інвестыцыямі ў навуку, — падсумаваў вучоны.

Другі праект «Дом для арла» датычыцца непасрэдна дзікай прыроды: ён мусіць вырашыць «жыллёвае пытанне» драпежных птушак. Справа ў тым, што з кожным годам становіцца ўсё менш вялікіх дрэў, прыдатных для ўладкавання скапы, арлана-белахвоста, беркута, змеяеда. Праблема абвастрэцца яшчэ і таму, што кожны год драпежныя птушкі засяляюць новае гняздо. Партнёрам ініцыятывы стала таварыства з абмежаванай адказнасцю «Сушы Хаус», якое праводзіць акцыі па зборы сродкаў. Сам праект пакуль знаходзіцца ў пачатковай стадыі: для яго рэалізацыі неабходна выявіць месцы для ўстаноўкі штучных гнёздаў, падлічыць іх прыкладную колькасць і матэрыяльныя затраты. Ужо 29 жніўня адбудзецца адкрыццё будаўнічага сезона: у «Чырвоным бары» пачнуць рабіць платформы для арлоў. Плануецца, што з часам усе ахвотныя змогуць набыць імяннае гняздо для птушкі (такі падарунак абыдзецца прыкладна ў 700 тысяч рублёў) і ўстанавіць там камеру для відэа-назірання.

На працягу некалькіх апошніх гадоў навукоўцамі вядзецца праца па вывучэнні крыніц Беларусі. Яна стане асновай праекта «Жывая вада. Чыстая крыніца».

— Мы збіраемся сабраць і сістэматызаваць інфармацыю пра ўсе крыніцы Беларусі, цікавыя як гісторыка-культурныя і турыстычныя аб'екты, — удакладніў Сяргей Плыткевіч. — На месцах будзем правяраць якасць вады, бо, як вядома, гідралагічнае становішча мяняецца. Дагледжаныя крыніцы ўключым у спіс турыстычных маршрутаў. Зробім топ-10 самых цікавых, выдадзім даведнік. А занядбаныя крыніцы будуць аднаўляцца сіламі ініцыятыўнай групы.

Ігар Качаноўскі дадаў, што па выніках праекта з'явіцца магчымасць узяць пад ахову самыя каштоўныя крыніцы і аб'явіць іх помнікамі прыроды. У рамках ініцыятывы «Жывая вада. Чысты бераг» мяркуецца выбраць участкі рэк і азёр, якім патрабуецца пастаянная прыборка і назіранне, а пасля арганізаваць вываз смецця з тэрыторый, устанавіць кантэйнеры і прыбіральні на ачышчаных участках.

Намеснік міністра расказаў, што ў найбліжэйшы час плануецца правесці акцыі па зарыбленні вадаёмаў каштоўнымі абарыгеннымі відамі рыб. Ён таксама адзначыў: апякунскі савет чакае прапаноў па развіцці іншых кірункаў дзейнасці. Больш дэталёва азнаёміцца з праектамі фонду і прапанаваць сваю дапамогу можна праз сайт арганізацыі fondprirodа.by.

**Кацярына РАДЗЮК**
*radziuk@zviazda.by*

# ЗАО «ИнтерПэйБанк»

ул. Некрасова, 114, г. Минск, 220068, Республика Беларусь
Телефон: +375 17 287 83 21

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | **АКТИВЫ** | | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | | 2 949 | 15 659 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | | | 10 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | | 5 890 | 558 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | | 3 411 | 3 573 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | | 226 784 | 181 450 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | | 417 | 29 457 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | | - | - |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | | - | - |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | | 20 801 | 19 618 |
| 11 | Имущество, предназначенное для продажи | 1110 | | | - |
| 12 | Отложенные налоговые активы | 1111 | | - | |
| 13 | Прочие активы | 1112 | | 21 627 | 7 806 |
| 14 | ИТОГО активы | 11 | | 281 879 | 258 131 |
| **15** | **ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | | |
| 16 | Средства Национального банка | 1201 | | - | - |
| 17 | Средства банков | 1202 | | 7 244 | 19 944 |
| 18 | Средства клиентов | 1203 | | 35 892 | 24 732 |
| 19 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1204 | | - | - |
| 20 | Производные финансовые обязательства | 1205 | | - | - |
| 21 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | | - | |
| 22 | Прочие обязательства | 1207 | | 1 915 | 2 932 |
| 23 | ВСЕГО обязательства | 120 | | 45 051 | 47 608 |
| **24** | **СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ** | | | | |
| 25 | Уставный фонд | 1211 | | 150 394 | 150 394 |
| 26 | Эмиссионный доход | 1212 | | 1 | 1 |
| 27 | Резервный фонд | 1213 | | 9 491 | 8 841 |
| 28 | Фонды переоценки статей баланса | 1214 | | 16 728 | 13 799 |
| 29 | Накопленная прибыль | 1215 | | 60 214 | 37 488 |
| 30 | ВСЕГО собственный капитал | 121 | | 236 828 | 210 523 |
| 31 | ИТОГО обязательства и собственный капитал | 12 | | 281 879 | 258 131 |

## ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 июля 2015 г.

(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | Пункт примечаний | 2015 год | 2014 год |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | | 6 523 | 8 442 |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | | 583 | 2 793 |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | | 5 940 | 5 649 |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | | 17 762 | 18 440 |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | | 1 087 | 1 501 |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | | 16 675 | 16 939 |
| 7 | Чистый доход по операциям с драгоценными металлами и драгоценными камнями | 203 | | | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | | (-1407) | 379 |
| 9 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 205 | | 50 037 | 13 130 |
| 10 | Чистый доход по операциям с производными финансовыми инструментами | 206 | | | (-15) |
| 11 | Чистые отчисления в резервы | 207 | | 39 225 | 9 002 |
| 12 | Прочие доходы | 208 | | 416 | 3 137 |
| 13 | Операционные расходы | 209 | | 19 386 | 27 204 |
| 14 | Прочие расходы | 210 | | 390 | 692 |
| 15 | Прибыль (убыток) до налогообложения | 211 | | 12 660 | 2 321 |
| 16 | Расход (доход) по налогу на прибыль | 212 | | 1 789 | 1 848 |
| 17 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | | 10 871 | 473 |

**Руководитель** **О.В.Рассохо**

**Дата подписания «22» июля 2015 г.**

УНП 807000030.

---

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона)
ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА
СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ**

# ПО ПРОДАЖЕ ПРЕДПРИЯТИЯ

### как имущественного комплекса со зданием котельной с дымовой трубой и солевым бассейном, оборудованием котельной, мебелью,

**расположенного по адресу:
Минская обл., г. Несвиж, ул. Кутузова, 7,
принадлежащего ОАО «Криница» (Продавец).**

Земельный участок площадью 5,2286 га с кадастровым номером 624250100001000118. Целевое назначение – размещение промышленных объектов. Право постоянного пользования. Земельный участок площадью 0,3600 га с кадастровым номером 624250100001000119. Целевое назначение – размещение промышленных объектов. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Начальная цена без НДС – 46 655 320 800 бел. руб. НДС оплачивается покупателем согласно действующему законодательству Республики Беларусь. Задаток – 750 000 000 бел. руб. Шаг аукциона – 25 000 000 бел. руб.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже предприятия как имущественного комплекса, принадлежащего ОАО «Криница»,* **проводимом 4 сентября 2015 г.**

Договор купли-продажи Объекта должен быть подписан в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта: предоплата – 30%, 70% от стоимости в течение 90 календарных дней с момента подписания акта приема-передачи ПИК. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Аукцион состоится **04.09.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 02.09.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 16.06.2015.* С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Дополнительная информация: 8(017) 306-00-57, 8(029) 356-90-03, 8(029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

---

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона)
по поручению государственного предприятия «ЦЕНТРКУРОРТ»**

# ПРОВОДИТ ПОВТОРНЫЙ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН по продаже автобуса VANHOOL 927

### номер рамы YF2927SD366M25819 2000 г.в.

**Начальная цена с НДС – 663 987 000 бел. руб.
Задаток – 20 000 000 бел. руб.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже автобуса VANHOOL 927, принадлежащего ГУ «ЦЕНТРКУРОРТ»*, **проводимом 4 сентября 2015 г.**

Аукцион состоится **04.09.2015 в 11.30** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 02.09.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 17.03.2015.*

Условия участия, срок заключения договора купли-продажи, условия оплаты, а также полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**Телефоны для справок:
8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52.**

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

# ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

| Наименование | Характеристика |
|---|---|
| **ЛОТ 1** | |
| **Наименование объекта, краткая характеристика** | - капитальное строение, инв. № 451/С-228 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание АБК), площадью 148,1 кв.м, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2. Составные части и принадлежности: электрическая сеть, водопроводная сеть, канализационная сеть.<br>- капитальное строение, инв. № 451/С-231 (назначение – здание специализированное коммунального хозяйства, наименование – котельная), площадью 339,3 кв.м, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2.<br>- капитальное строение, инв. № 451/С-230 (назначение – сооружение неустановленного назначения, наименование – компрессорная), площадью 67,2 кв.м, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2.<br>- капитальное строение, инв. № 451/С-226 (назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – трансформаторная подстанция), площадью 46,6 кв.м, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2, корп. 3.<br>- капитальное строение, инв. № 451/С-14167 (назначение – сооружение специализированное железнодорожного транспорта, наименование – внутриплощадочный ж/д путь), площадью 420,2 кв.м, расположенное по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2. Составные части и принадлежности: линейная часть подъездного железнодорожного пути, стрелочный перевод, железнодорожный переезд |
| **Земельный участок, на котором расположен объект** | - кадастровый номер 422356300002000075 (назначение – размещение промышленных объектов), площадью 3,3565 га, расположенном по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельные учаски, расположенные в охранных зонах линий электропередачи, площадью 0,051 га.<br>- кадастровый номер 422356300002000753 (назначение – земельный участок для размещения объектов железнодорожного транспорта), площадью 0,0119 га, расположенном по адресу: Новоельнянский с/с, г.п. Новоельня, ул. Заводская, д. 2/1 |
| **Начальная цена продажи** | 2 542 570 800 (два миллиарда пятьсот сорок два миллиона пятьсот семьдесят тысяч восемьсот) белорусских рублей с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 127 128 540 (сто двадцать семь миллионов сто двадцать восемь тысяч пятьсот сорок) белорусских рублей |
| **Продавец** | ОАО «Дорожно-строительный трест № 6», 230026, г. Гродно, ул. Победы, 13, тел. 54-31-08, факс 8-017-210-84-14 |
| **Организатор торгов** | Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34 |
| **Условия аукциона** | Возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 3% от конечной цены продажи объекта |
| **Условия оплаты** | По договоренности сторон |
| **Срок заключения договора купли-продажи** | Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225 |

**Аукцион состоится 28 сентября 2015 г. в 11.00 по адресу:
Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209**

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

*юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь* – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

*индивидуальным предпринимателем* – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

*юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь* – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу:
г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209,
с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)**

**Последний день приема заявлений – 22 сентября 2015 г. до 15.00**

**Телефон для справок: 41-98-32 –
Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**

---

**РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки» извещает о проведении открытого аукциона по продаже машин и оборудования, принадлежащих республиканскому унитарному предприятию «Производственное объединение «Белоруснефть» на праве хозяйственного ведения**

| № лота | Наименование предмета торгов, краткая характеристика | Начальная цена, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) | Задаток, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) | № лота | Наименование предмета торгов, краткая характеристика | Начальная цена, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) | Задаток, бел. руб. (в т.ч. НДС 20%) |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Машина для автоматического разрезания ткани «РоллТекс» А-01.1-183 | 3 009 119 | 301 000 | 16 | Плосковязальная машина STOLL CMS 933 E10 | 493 625 923 | 49 363 000 |
| 2 | Гладильная установка ПГУ-2-101 ЭКО (Б) в комплекте | 2 341 129 | 234 000 | 17 | Компактный электропаровой ручной гладильный пресс QPFB-10 | 1 226 453 | 123 000 |
| 3 | Гладильная установка ПГУ-1-100 (Б) в комплекте с ПГ-6 | 2 906 160 | 291 000 | 18 | Компактный электропаровой ручной гладильный пресс QPFB-10 | 1 226 453 | 123 000 |
| 4 | Стол гладильный 2550 | 13 479 970 | 1 348 000 | 19 | Компактный электропаровой ручной гладильный пресс QPFB-10 | 1 226 453 | 123 000 |
| 5 | Двухигольная машина челночного стежка JUKI LH-3168 SF | 5 088 535 | 501 000 | 20 | Компактный электропаровой ручной гладильный пресс QPFB-10 | 1 226 453 | 123 000 |
| 6 | Двухигольная стачивающе-обметочная машина цепного стежка | 2 645 099 | 265 000 | 21 | Планшетный плоттер для рисования и вырезки лекал Graphtec FC2250-180VC | 228 147 318 | 22 815 000 |
| 7 | Машина плосковязальная TECHNOTEX PK-127 | 82 401 521 | 8 240 000 | 22 | Стол закройщика МБ 88.13 | 3 016 019 | 302 000 |
| 8 | Вязальная машина кеттельная KMF 660/3 класс 9 | 6 840 470 | 684 000 | 23 | Стол закройщика МБ 88.13 | 3 016 019 | 302 000 |
| 9 | Вязальная машина кеттельная KMF 660/3 класс 9 | 6 840 470 | 684 000 | 24 | Стол закройщика МБ 88.13 | 3 016 019 | 302 000 |
| 10 | Двухигольная машина челночного стежка JUKI LH-3168 SF | 5 409 780 | 541 000 | 25 | Стол закройщика МБ 88.13 | 3 016 019 | 302 000 |
| 11 | Автоматизированная закрепочная машина JUKI LK-1900AHS/MS-596 | 13 057 787 | 1 306 000 | 26 | Стол закройщика МБ 88.13 | 3 016 019 | 302 000 |
| 12 | Автоматизированная закрепочная машина JUKI LK-1900AHS/MS-596 | 13 057 787 | 1 306 000 | 27 | Стол закройщика МБ 88.13 | 3 016 019 | 302 000 |
| 13 | Пресс пневматический ПП-4-6 | 1 998 088 | 200 000 | 28 | Стол закройщика МБ 88.13 | 3 016 019 | 302 000 |
| 14 | Гладильная установка ПГУ-1-115 | 5 327 552 | 533 000 | 29 | Стол закройщика МБ 88.13 | 3 016 019 | 302 000 |
| 15 | Плосковязальная машина STOLL CMS 502 E7 | 257 554 652 | 25 755 000 | 30 | Стол раскройный SR-2 размер (мм) 6000*1800 | 8 094 166 | 809 000 |

**Аукцион состоится 24 сентября 2015 г. по адресу: г. Гомель, ул. Артема, 23. Начало в 10⁰⁰.**

Заявления на участие в аукционе с приложением необходимых документов принимаются по адресу: **г. Гомель, ул. Артема, 23, 2-й этаж, каб. 2-6** по рабочим дням с 9.00 до 12.00 и с 13.00 до 16.00 **по 21 сентября 2015 г. включительно**. Подача документов по почте не допускается. Заявления, поступившие позже установленного срока, не рассматриваются.

В аукционе имеют право участвовать индивидуальные предприниматели, физические и юридические лица, своевременно подавшие заявление на участие в аукционе с приложением необходимых документов, внесшие задаток по заявленному лоту до подачи заявления и прошедшие заключительную регистрацию с 09.00 до 10.00 **24 сентября 2015 г**. Участник торгов, желающий участвовать в торгах в отношении нескольких предметов торгов, вносит задатки в размере, установленном для каждого из предметов торгов.

Продавец вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до наступления даты его проведения.

Аукционные торги проводятся в соответствии с Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12 июля 2013 г. № 609.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену на аукционе; лицом, приравненным к победителю, признается единственный зарегистрированный участник, выразивший согласие купить предмет торгов.

**При подаче заявления участник должен иметь**: 1) копию платежного поручения с отметкой банка, подтверждающего внесение задатка для участия в аукционе; 2) физическое лицо – паспорт; представитель физического лица – паспорт и нотариально заверенную доверенность; индивидуальный предприниматель – паспорт, копию свидетельства о государственной регистрации и его подлинник для заверения его копии организатором аукциона; представитель индивидуального предпринимателя – паспорт и доверенность; представитель юридического лица (резидент РБ) – паспорт (руководитель – копию приказа, протокола о назначении на должность), доверенность на участие в аукционе и подписание документов, копии учредительных документов и свидетельства о государственной регистрации организации и их подлинники для заверения их копий организатором аукциона; представитель юридического лица (нерезидент РБ) – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из государственного реестра юридических лиц страны происхождения (выписка должна быть датирована не позднее шести месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе) или иное эквивалентное доказательство юридического статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с нотариально удостоверенными переводами на белорусский (русский) язык.

В случае отсутствия у физического лица текущего счета необходимо его открыть.

Задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления на **р/с 3012230570008 в ЗАО «Альфа-Банк», код 153001270. Получатель платежа – РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки». УНП 490318588. Назначение платежа:** задаток для участия в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 25 августа 2015 г.

Задаток, уплаченный участником аукциона, ставшим победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), будет засчитан в счет окончательной стоимости предмета торгов. Задаток, уплаченный участниками аукциона, не ставшими победителем аукциона (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов), Организатор аукциона возвращает безналичным платежом на их счета в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона.

**Победитель торгов (единственный участник, выразивший согласие купить предмет торгов) обязан**: в течение 3-х рабочих дней после подписания протокола о результатах аукциона возместить Организатору затраты на организацию и проведение аукциона, об утвержденной сумме которых уведомляется перед началом аукциона; в течение 10-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона заключить с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов; в течение 10-ти календарных дней с момента заключения договора купли-продажи выплатить Продавцу стоимость предмета торгов, сформированную в установленном порядке.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его победителем (единственным участником, выразившим согласие купить предмет торгов) в случаях, предусмотренных законодательством и соглашением, составляет десять базовых величин за каждый случай нарушения.

**Организатор: РУП «Гомельский институт недвижимости и оценки», г. Гомель, ул. Артема, 23. ☎ 8 (0232) 70-46-47; 75-50-76 • www.gino.by • e-mail: info@gino.by
Продавец: РУП «Производственное объединение «Белоруснефть», г. Гомель, ул. Рогачевская, 9 • 8 (029) 121-04-40 •**

# ДЗЯВЯТЫ ВАЛ

## ЦІ СПРАВІЦЦА СТАРЫ СВЕТ З НЕБЫВАЛЫМ НАПЛЫВАМ БЕЖАНЦАЎ?

**У Еўропе пачаўся чарговы маштабны крызіс. Стары Свет сутыкнуўся з адной з найбольш сур'ёзных міграцыйных праблем у сваёй гісторыі — процьмай бежанцаў. У многіх еўрапейскіх краінах людзі пачалі масава выходзіць на мітынгі з патрабаваннем да ўлад неадкладна спыніць паток перасяленцаў з афрыканскіх краін і абараніць межы ад мігрантаў, што ў вялізнай колькасці прыбываюць праз Міжземнае мора (іх ужо налічылі каля чвэрці мільёна чалавек, і лічба будзе павялічвацца). Аднак сістэмна ўзяцца за ўрэгуляванне крызісу з нелегальнымі мігрантамі ў Еўрасаюзе вымушаны былі пасля таго, як 30 ліпеня каля тысячы мігрантаў распачалі новую спробу праравацца ў тунэль пад Ла-Маншам з боку французскага горада Кале, каб перабрацца ў Вялікабрытанію. Як паказаў час, гэта быў толькі першы сур'ёзны «званочак». Дык што ж урэшце чакае Стары Свет?**



### КЛАСТАР УТРЫМАНЦАЎ

Праблема міграцыі ў Еўропе ўзнікла не ўчора, яна мае вельмі глыбокія гістарычныя карані. Выбуховая сітуацыя пачала разгортвацца яшчэ ў сярэдзіне 1940-х. Міжнародныя заканадаўчыя акты ў вобласці правоў чалавека, прынятыя пасля Другой сусветнай вайны, пазначылі агульную лібералізацыю. Не абмінулі яны і міграцыйныя працэсы. Як вядома, пасляваенны падзел Еўропы ў першыя часы абумовіў хвалю міграцыі ў краіны Заходняга блока. Разам з тым бурнае аднаўленне патэнцыялу еўрапейскіх краін і наступныя ўражальныя тэмпы сацыяльна-эканамічнага развіцця патрабавалі працоўнай сілы звонку. На «лімітных» наборах рабочых уздымаліся цэлыя галіны прамысловасці, напрыклад аўтамабілебудаванне ў Францыі. Істотная колькасць працоўных прыцягвалася з дзяржаў «пераможанага лагера» — Іспаніі, Партугаліі, Італіі, Грэцыі, паведамляе expert.ru.

Напрыканцы мінулага стагоддзя, з павелічэннем узроўню дабрабыту гэтых краін і ўсёй Еўропы ўвогуле, патрэбныя працоўныя рукі давялося прывозіць з былых афрыканскіх калоній і дзяржаў колішняга сацлагера. Каб палегчыць працэс «дастаўкі», быў адкрыты міграцыйны «клапан» — і паток мігрантаў проста захліснуў Еўропу. На думку экспертаў, гэтаму няmala спрыялі надзвычай ліберальная пазіцыя Брусселя і адсутнасць цвёрдых межаў на прасторы ЕС.

Высакародныя ідэі еўрапейскага грамадства пра годнае жыццё для кожнага грамадзяніна хутка павярнуліся супраць саміх сябе. Нізкакваліфікаваныя мігранты апанавалі сектар «непрэстыжных» для карэнных еўрапейцаў прафесій, а потым, у сілу беспрацоўя, аселі на шыі дзяржаў, якія іх прытулілі, атрымаўваючы нядрэнныя дапамогі і льготы. Такое становішча хутка ператварылася ў звычку, і бюджэт Еўропы атрымаў цэлы кластар утрыманцаў, якія не гатовы і, галоўнае, не жадаюць працаваць.

### КАРОТКАЯ ПЕРАДЫШКА

Па розных ацэнках, агульная колькасць нелегальных мігрантаў у краінах Еўрасаюза складае ад 5 да 8 млн чалавек. На жаль, не існуе афіцыйнай еўрапейскай статыстыкі колькасці нелегалаў, але, як вынікае з асобных крыніц, больш за ўсё іх — па 1-1,5 млн — налічваецца ў Германіі, Францыі, Грэцыі, Італіі, Іспаніі. Прытым апошнія дзве краіны і Кіпр з'яўляюцца галоўным перавалачным пунктам для нелегалаў з Паўночнай Афрыкі. Праз Грэцыю ў іншыя краіны ЕС накіроўваецца паток з Турцыі і Афганістана, да іх таксама дадаліся і бежанцы з Сірыі. Па звестках ААН, лік уцекачоў з гэтай краіны дасягнуў 2 мільёнаў чалавек, з іх 678 тыс. прыбылі ў Ліван, 516 тыс. — у Іарданію, 434 тыс. — у Турцыю. Па звестках агенцтва Frontex, 90% прытоку мігрантаў у краіны Паўднёвай Еўропы складалі бежанцы менавіта з гэтых рэгіёнаў.

У пачатку 2010-х становішча змянілася імкліва: калі ў 2009-м было зафіксавана 3,5 тысячы незаконных перасячэнняў мяжы Еўрасаюза, то ў 2013-м — ужо 140 тыс. Больш за ўсё бежанцаў апынуліся ў Італіі і на Мальце — звыш 45% усіх нелегалаў, што прыбываюць у Еўропу. Праўда, 2012 год, канстатавалі спецыялісты, быў перыядам параўнальнага зацішша, калі сітуацыя значна палепшылася — прыток мігрантаў зменшыўся амаль удвая. Але, як паказаў час, палёгка была непрацяглай. Летась краіны ЕС прынялі каля 250 тысяч бежанцаў з краін Афрыкі і Блізкага Усходу. Па прагнозах экспертаў, сёлета іх колькасць можа вырасці ў разы.

### МАРСКІЯ МОГІЛКІ

Італію накрыў сапраўдны «дзявяты вал» мігрантаў з Лівіі і іншых афрыканскіх краін. Дзясяткі тысяч людзей садзяцца на надзіманыя лодкі і ненадзейныя судначчкі і адпраўляюцца да італьянскага вострава Лампедузе — найбліжэйшай да Афрыкі еўрапейскай тэрыторыі. Цэнтральная частка Міжземнага мора ў раёне Сіцыліі ўсё больш ператвараецца ў велізарныя могілкі. Плаванне з Лівіі ў Італію ўтойвае мноства небяспек, улічваючы стан плывучых сродкаў і іх перагружанасць. Мінулы год быў адзначаны сумнай статыстыкай. Летась у моры патанулі каля 3,5 тысячы мігрантаў. Аднак сёлета сітуацыя можа стаць яшчэ горш. У міжземнаморскіх водах загінулі ўжо звыш дзвюх тысяч афрыканцаў, сярод якіх вельмі шмат жанчын і дзяцей.

Абвастрэнне становішча ў Лівіі, дзе ідзе грамадзянская вайна, прымушае тутэйшых жыхароў пакідаць радзіму і перабірацца ў Еўропу. Пераважная большасць накіроўваецца ў Італію: да яе, як ім здаецца, рукою падаць. Па словах высокапастаўленых чыноўнікаў, колькасць афрыканцаў, якія імкнуцца ў Італію, да канца года можа дасягнуць мільёна чалавек! Тым часам цэнтры для бежанцаў ужо даўно перапоўнены і не спраўляюцца з «цунамі» нелегалаў.

> **Відавочна, што сітуацыя выходзіць з-пад кантролю па ўсёй Еўропе. Што з гэтым рабіць, палітыкі і чыноўнікі, здаецца, пакуль не ведаюць. Тым часам людзі ўсё едуць і едуць. Адну толькі Сірыю з-за вайны пакінулі ўжо чатыры мільёны чалавек.**

Клопат пра мігрантаў цяжкім грузам кладзецца на італьянскую эканоміку, якая ніяк не выйдзе з пяцігадовай рэцэсіі. Тое, што Італія не можа справіцца з наплывам уцекачоў, відаць на адным простым прыкладзе. Усяго год дзейнічала італьянская праграма выратавання мігрантаў «Міжземнае мора». Увосень мінулага года з-за нястачы сродкаў яе давялося закрыць і замяніць такой ж па мэтах, але не па ўтрыманні і эфектыўнасці праграмай еўрапейскага памежнага агенцтва Fortex — «Трытон». Неўзабаве пасля таго, як выратаваннем заняліся еўрапейскія памежнікі, лік ахвяр рэзка павялічыўся. І справа тут не ў тым, што італьянскія памежнікі дабрэйшыя і больш уважлівыя за еўрапейскіх. Прычына ў маштабах дзвюх праграм. Калі падчас праўдзення «Мора» пад кантролем трымалася тэрыторыя плошчай каля 70 тысяч кв. км, то цяпер памежнікі сочаць толькі за 30-кіламетровай паласой уздоўж узбярэжжа Італіі. Калі ў «Моры» бралі ўдзел да 900 італьянскіх памежнікаў і супрацоўнікаў берагавой аховы, то ў «Трытоне» — толькі 65. Красамоўнае і параўнанне фінансавання праграм: «Міжземнае мора» — 9 мільёнаў еўра ў месяц, а «Трытон» — 2,7 млн.

### НАПРУГА НА АСТРАВАХ

Міжземнаморскі маршрут з'яўляецца асноўным шляхам дастаўкі нелегалаў у Еўропу, другі па маштабах транзітны маршрут праходзіць праз Балканы. Па звестках агенцтва Frontex, праз Грэцыю, Балгарыю і Кіпр у 2011-2012 гадах на тэрыторыю ЕС прабраліся амаль палова ўсіх нелегальных мігрантаў. Усяго, па некаторых ацэнках, на тэрыторыі Грэцыі знаходзяцца ад 800 тыс. да 1 млн нелегалаў. Гэтаму спрыяла далучэнне Грэцыі да Шэнгенскага пагаднення і пагаршэнне становішча на Блізкім Усходзе і ў Паўночнай Афрыцы.

Вялікая частка з прыкладна 50 тыс. бежанцаў, якія прабраліся ў Грэцыю толькі ў ліпені (дарэчы, гэта больш, чым на працягу ўсяго мінулага года), трапіла на тэрыторыю Элады праз астравы на ўзбярэжжы Турцыі. Найбольш цяжкае становішча склалася на востраве Кос. Там адбыліся сутыкненні паміж мігрантамі і паліцыяй, пасля якіх больш за дзве тысячы чалавек замкнулі на мясцовым стадыёне. Выбуховая напруга нарастае і на іншых грэчаскіх астравах каля турэцкага ўзбярэжжа. З пачатку года на іх прыбылі больш за 120 тыс. мігрантаў, тады як за ўвесь мінулы год — менш за 30 тыс.

З-за крызісу і недахопу грошай грэчаская паліцыя і міграцыйная служба не ў стане хутка рабіць усю патрэбную працу. Не хапае месцаў для размяшчэння людзей, часам нестае ежы і нават вады. У выніку такой блытаніны і ўзнікаюць выбуховыя сітуацыі, падобныя да той, што склалася цяпер на Косе. Тым часам большасць сірыйскіх уцекачоў, якіх у Турцыі цяпер сабралася звыш 1,6 млн чалавек, нягледзячы на тое, што адбываецца на астравах, усё адно маюць намер адправіцца ў Грэцыю.

Да нядаўніх падзей на Косе, насельніцтва якога не перавышае 30 тыс. чалавек, самае напружанае становішча было на Лесбасе. Туды для падтрымання парадку Афіны адправілі нават вайсковыя падраздзяленні. На дапамогу Брусель штогод накіроўвае сотні салдат Frontex — памежнага агенцтва Еўрасаюза. Але і гэта не ратуе сітуацыю. Паўтара года назад улады Грэцыі нават абвясцілі, што маюць намер узвесці сцяну на мяжы, але пазней адмовіліся ад гэтай ідэі з-за адсутнасці грошай. Сітуацыя напалілася гэтак, што летась увосень у ЕС задумаліся пра тое, каб выключыць Грэцыю з Шэнгенскай зоны. Праўда, афіцыйнага пацвярджэння гэта інфармацыя не атрымала.

На пачатку жніўня ўлады Грэцыі пачалі беспрэцэдэнтную аперацыю супраць нелегальных мігрантаў. Як паведамляе France-Presse, у аблавах бралі ўдзел 2 тыс. паліцэйскіх у Афінах і 2,5 тыс. памежнікаў, змешчаных на мяжы з Турцыяй. Толькі ў адзін дзень у Афінах былі затрыманы 4 900 нелегалаў, з якіх 1 130 у той жа дзень былі выправаджаны з тэрыторыі Грэцыі.

### ПА-ЗА КАНТРОЛЕМ

Дапамога насамрэч паступае. Выдзяляюцца сродкі тым, хто першы прымае той самы «дзявяты вал». Да 2020 года Італіі выдзеляць каля 560 мільёнаў еўра, трохі менш атрымаюць Іспанія і Грэцыя. Дапамогу для вырашэння міграцыйных праблем ужо атрымала Францыя, яшчэ раней грошы былі пералічаны Брытаніі.

У лакаматыва еўрапейскай эканомікі таксама сур'ёзныя праблемы. У Францыі тунэль пад Ла-Маншам штурмуюць кожную ноч. У Германіі ў шэрагу месцаў прыезджых гэтулькі, што карэнныя жыхары апынуліся ў меншасці. Брытанія вельмі прывабная для перасяленцаў, да апошняга часу там былі ліберальныя законы для іміграцтаў. Высокі ўзровень жыцця і адладжаная сістэма сацыяльнага забеспячэння — гэта асноўныя прычыны, па якіх мноства перасяленцаў хацелі б застацца ў Злучаным Каралеўстве назаўжды. Павелічэнне прытоку мігрантаў катастрафічнае. Паводле апытанняў, большасць грамадзян краіны лічаць, што Вялікабрытанія ўжо «перанаселена» і неабходны надзвычайныя меры па абмежаванні ўезду мігрантаў.

Першасны размеркавальны лагер для мігрантаў у аўстрыйскім Трайскірхене перапоўнены. Ён разлічаны на 2 тысячы чалавек, але цяпер тут знаходзіцца ўдвая больш. Мясцовыя незадаволены. «Гэта ганьба — тое, што адбываецца ў Аўстрыі. Мы ж багатая краіна! І ў самым цэнтры гэтай багатай краіны людзі сядзяць на асфальце, і калі нехта прыносіць ім ежу, яны бягуць і літаральна выдзіраюць прадукты з рук, быццам дзікія звяры. Так не можа доўга працягвацца!» — абураецца мясцовая жыхарка Марыэла Гужэль.

У сутыкненнях з паліцыяй бяруць удзел сотні выхадцаў з краін трэцяга свету. Ёсць і пацярпелыя. Адзін са шматлікіх прыкладаў: спрабуючы ўцякаць, паліцэйскія іспанскага курортнага горада Салоу давялося адкрыць стральбу ў паветра. Гэта выхадцаў з Сенегала не спыніла. Яны працяглі паліць смецевыя кантэйнеры, граміць паліцэйскія аўтамабілі і будаваць барыкады на чыгуначных пуцях. Хваляванні ўспыхнулі пасля рэйду супраць незаконных вулічных гандляроў. Адзін з іх, уцякаючы, выкінуўся з акна і загінуў...

Відавочна, што сітуацыя выходзіць з-пад кантролю па ўсёй Еўропе. Што з гэтым рабіць, палітыкі і чыноўнікі, здаецца, пакуль не ведаюць. Тым часам людзі ўсё едуць і едуць. Адну толькі Сірыю з-за вайны пакінулі ўжо чатыры мільёны чалавек.

### БЕЗ ШЭНГЕНА?

І з апошніх падзей, што называецца, у тэму. 20 жніўня Македонія абвясціла пра ўвядзенне надзвычайнага становішча і перакрыла сваю паўднёвую мяжу. Пры гэтым паліцыя ўжыла супраць мігрантаў, што спрабавалі трапіць на тэрыторыю краіны, слязісты газ і святлошумавыя гранаты. Аднак цяпер, па словах сведак, прапускны пункт у Гевеліі цалкам адкрыты, і ў Македонію патокам рушаць мігранты, пераважна з Сірыі, Ірака і Афганістана. У Македоніі яны перасаджваюцца на аўтобусы і цягнікі і адпраўляюцца далей у Сербію і краіны Еўрасаюза. Большасць накіроўваецца на поўнач кантынента, іх шлях ляжыць праз Венгрыю.

У мінулыя выхадныя ў Сіцылійскім праліве, што аддзяляе Лівію ад паўднёвага ўзбярэжжа Італіі, было выратавана 4,4 тысячы іміграцтаў. Як паведаміла ў нядзелю італьянская служба берагавой аховы, гэта абсалютны рэкорд. Як перадае ТАСС, усяго былі праведзены 22 аперацыі па выратаванні. У нядзелю выратаваных мігрантаў даставілі ў розныя італьянскія порты. У тым ліку амаль тысяча іміграцтаў плывуць у Кальяры на востраў Сардзінія, больш 500 — у Палерма, яшчэ 500 накіроўваюцца ў порт Аўгуста на Сіцылію.

У сувязі з успleskам незаконнай міграцыі ў Еўропе загучалі заклікі закрыць межы ў Шэнгенскай зоне, абмяжаваўшы адзін з утваральных пастулатаў ЕС — права на свабоду перамяшчэння. Напярэдадні пра гэта казалі кіраўнік МУС Германіі Томас дэ Мезьер, а таксама міністр замежных спраў Італіі Паола Джэнцілоні.

«Мы бачым напружаную сітуацыю на сіцылійскім узбярэжжы, на грэчаскіх астравах, у Македоніі і Венгрыі. У доўгатэрміновай перспектыве гэта можа паставіць пад пытанне Шэнгенскія пагадненні», — заявіў Джэнцілоні. Ён падкрэсліў, што мігранты «прыбываюць не ў Італію, Грэцыю ці Венгрыю, а ў Еўропу».

Бельгійскі прэм'ер Шарль Мішэль даў інтэрв'ю тэлеканалу РТЛ пасля спробы здзяйснення тэракта ў цягніку Thalys. «Шэнгенскія пагадненні важныя для нашай эканомікі, аднак перад тварам тэрарыстычнай пагрозы мы, магчыма, павінны будзем іх перагледзець», — цытуе кіраўніка бельгійскага ўрада ТАСС. Ён паведаміў, што ўжо абмяркоўвае ідэю з тэлефоннай гутаркі з прэзідэнтам Францыі Франсуа Аландам і што гэта дыскусія працягнецца ў Брусселі на розных узроўнях. Дарэчы, лідары Еўрасаюза ўжо назвалі цяперашнюю сітуацыю «найгоршым крызісам бежанцаў з часоў Другой сусветнай вайны».

Мікалай ЛІТВІНАЎ.
litvinov@zviazda.by

■ Спорт-тайм

# ШЧАСЛІВАЯ ВАДА МІЛАНА

**На чэмпіянаце свету па веславанні на байдарках і каноэ ў італьянскім Мілане нашы спартсмены заваявалі 10 узнагарод, з якіх 5 залатых, 2 сярэбраныя і 3 бронзавыя**

**Марына Літвінчук выйграла «золата» на дыстанцыі 5000 м у класе К1. Экіпаж байдаркі-чацвёркі ў складзе Маргарыты Махневай, Надзеі Ляпешкі, Вольгі Худзенкі і Марыны Літвінчук перамог у фінале А класа К4 на 500 м. У неалімпійскім класе К2 на 200 м Махнева і Літвінчук зноў першынствавалі з вынікам 38,477 сек. Пераможцамі сусветнага форуму ў класе жаночых каноэ-двоек (С2) на дыстанцыі 500 м стаў экіпаж у складзе Дарыны Касцючэнкі і Камілы Бобр. Яшчэ адно «золата» чэмпіянату беларускай зборнай прынёс канаіст Арцём Козыр, які выйграў фінал у класе адзіночак (С1) на 200 м.**

У неалімпійскім класе мужчынскіх каноэ-двоек (С2) на дыстанцыі 200 м сярэбранымі прызёрамі сусветнага форуму сталі беларусы Глеб Саладуха і Дзяніс Махлай (вынік — 37,516 сек). Таксама «серабро» сусветнага форуму заваяваў наш экіпаж жаночай байдаркі-двойкі (К2) на дыстанцыі 1000 м у складзе Соф'і Юрчанкі і Аляксандры Грышынай.

У спаборніцтвах мужчын у байдарках-адзіночках на 5000 м беларус Алег Юрэня стаў бронзавым прызёрам. Яшчэ адну «бронзу» ў медальную скарбонку зборнай Беларусі дадаў і Максім Пятроў. Ён фінішаваў трэцім у класе каноэ-адзіночак (С1) на дыстанцыі 500 м. Уладальніцай індывідуальнай узнагароды стала і Каміла Бобр. Яна прыйшла трэцяй да фінішу ў класе каноэ-адзіночак (С1) на дыстанцыі 200 м.

Акрамя медалёў, беларусы заваявалі ліцэнзіі на Алімпійскія гульні-2016. Іх шчаслівымі ўладальнікамі сталі не толькі прызёры чэмпіянату, але і спартсмены, якія выканалі алімпійскія нарматывы, а гэта Арцём Козыр, Алег Юрэня, Вольга Худзенка, Віталь Бялько і Раман Петрушэнка, браты Аляксандр і Андрэй Багдановічы, экіпаж мужчынскай байдаркі-чацвёркі ў складзе Паўла Мядзведзева, Андрэя Царыковіча, Віталя Бялько і Рамана Петрушэнкі.

**Галоўны трэнер зборнай Беларусі Уладзімір ШАНТАРОВІЧ**, ацэньваючы выступленне падапечных на сусветным форуме, застаўся задаволены стартамі. «Я б паставіў цвёрдую чацвёрку па выніках ліцэнзійнага чэмпіянату свету. Мы добра папрацавалі ў гэтым сезоне, і мінулыя старты паказалі, што за год да пачатку Алімпіяды мы рухаемся ў правільным кірунку», — адзначыў трэнер.



Такім чынам, у скарбонцы зборнай Беларусі 10 узагарод і 2-е месца ў медальным заліку. На першым — Германія, замыкае тройку наймацнейшых Аўстралія.

***Віншаванне нашым байдарачнікам з заваяваннем залатых медалёў на чэмпіянаце свету па веславанні на байдарках і каноэ ў італьянскім Мілане накіраваў Прэзідэнт краіны Аляксандр ЛУКАШЭНКА, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.***

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**

# БАТЭ ЗНОЎ У АДРЫВЕ

**У штотыднёвым спартыўным аглядзе «Звязда» расказвае пра ўдалае выступленне нашых прадстаўнікоў на чэмпіянаце Еўропы па баскетболе 3х3, пра пераможную серыю мінскага «Дынама», якая спынілася ў нядзелю, і іншых цікавых паядынках чэмпіянату краіны па футболе.**

**1. Беларускія дзяўчаты сталі сярэбранымі медалісткамі маладзёжнага (U-18) чэмпіянату Еўропы па баскетболе 3х3**, які 21-23 жніўня прымала «Palova Арэна», размешчаная каля мінскага Палаца спорту на Нямізе.

Беларускі, якія займаюць толькі 16-е месца ў рэйтынгу, вельмі добра правялі ўвесь турнір, прайграўшы адзін паядынак (за залатыя медалі), ды і то толькі ў авертайме. Ім супрацьстаялі лідары класіфікацыі — каманда Венгрыі.

У складзе зборнай Беларусі на турніры выступалі Марыя Іваненка, Ганна Лапо, Марыя Адашчык і Настасся Сушчык.

Беларускія хлопцы таксама выступілі на хатнім чэмпіянаце вельмі годна. У паядынку за бронзавыя медалі яны навязалі барацьбу іспанцам, двойчы адыгрываліся па ходзе матча, давялі справу да авертайму, але там не змаглі адолець саперніка. Мужчынскую каманду прадставілі Максім Лютыч, Цімафей Паралёў, Андрэй Рагозенка і Антон Зарэцкі.



Фота БЕЛТА.

**2. Мінскае «Дынама» спыніла сваю 7-матчавую пераможную серыю і зноў адпусціла БАТЭ ў адрыў.** Гэтаму паспрыялі футбалісты жодзінскага «Тарпеда-БелАЗ», якія ў матчы 17-га тура чэмпіянату краіны перамаглі «бела-блакітных» з лікам 1:0.

Лідар першынства барысаўскі БАТЭ на сваім полі не пакінуў ніякіх шанцаў гасцям з гродзенскага «Нёмана» — 7:1. У Салігорску мясцовы «Шахцёр» разграміў «Гомель» — 4:1, наваполацкі «Нафтан» саступіў бабруйскай «Белшыне» — 0:2. Сёмую перамогу запар атрымалі футбалісты «Мінска», якія ў сябе дома ўзялі верх над мазырскай «Славіяй» — 2:1.

**3. «Нёман» перамог нямецкі «Адлер» у сваім гістарычным першым матчы хакейнай Лігі чэмпіёнаў.** Гродзенскія хакеісты атрымалі перамогу на хатнім лёдзе над сапернікамі з нямецкага клуба «Адлер Мангейм». Матч у адказ беларускія хакеісты правядуць 27 жніўня. Праз тры дні, 30 жніўня, «Нёман» будзе сустракацца з чэшскім «Віткавіцэ» з Астравы на сваёй пляцоўцы, а выязная гульня пройдзе 4 верасня ў Чэхіі.

**4. Вікторыя Азаранка знялася з турніру ў Цынцынаці з-за траўмы.** У паядынку за выхад у чвэрцьфінал з расіянкай Настассяй Паўлючэнкавай беларуска ўпэўнена выйграла першую партыю з лікам 6:1, а ў другім пры ліку 3:0 на карысць расіянкі Азаранка вырашыла завяршыць барацьбу з-за траўмы сцягна.

На гэтым турніры Вікторыя спачатку была мацнейшай за амерыканку Ларэн Дэвіс — 6:1, 6:2, а ў паядынку другога круга ўпэўнена перайграла пятую ракетку планеты Каралін Вазняцкі з Даніі — 6:0, 6:4.

Беларуска паднялася на адну пазіцыю ў абноўленым рэйтынгу ВТА. Экс-першая ракетка свету цяпер займае 20-е месца.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

■ Экслібрыс «Звязды»

# АДКРЫЦЬ СТРАЛЬЦОВА

**Міхась Стральцоў. Выбраныя творы. — Мінск: Беларуская навука, 2015. — 652 с.**




Каб набыць гэтае выданне, мне давялося зазірнуць у некалькі сталічных кнігарняў. І кожны раз гісторыя паўтаралася: не знайшоўшы патрэбную кнігу на паліцы, я звярталася да прадаўца і атрымлівала кароткі адказ:

— Скончыліся. Неўзабаве прывязуць яшчэ, бо многія пакупнікі шукаюць.

А між іншым з часу выхаду кнігі прайшло крыху больш як два тыдні. Значыць, томік выбраных твораў Міхася Стральцова, што пабачыў свет у серыі «Беларускі кнігазбор» акурат напярэдадні 28-й гадавіны смерці пісьменніка, чытачы даўно чакалі і цяпер прынялі з цікавасцю і нават радасцю.

І гэта цалкам лагічна. Кнігі вершаў, прозы, публіцыстыкі, што выходзілі пры жыцці аўтара, паказвалі толькі асобныя рысы яго творчай індывідуальнасці. Так, у вершах Міхась Стральцоў выступае тонкім лірыкам, здольным бачыць прыгожае, ствараць незвычайныя метафары. Ён не баіцца творчага бунту і эксперымента, не ідзе за рыфмай, але кіруецца ўласным пачуццём стылю, прыгажосці.

У прозе гэты аўтар таксама не цураецца лірычнасці  як у мове твора, так і ў яго вобразнасці. Характары вымалёўвае з акцэнтам на дэталях, асаблівую ўвагу засяроджвае на пачуццях герояў, іх псіхалогіі. Напэўна, таму так «прыжыліся» ў разнастайных хрэстаматыях апавяданні-хіты Стральцова «Смаленне вепрука» і «Сена на асфальце». Тут аўтар з'яўляецца «медыятарам», правадніком, даючы голас цэламу пакаленню вясковых жыхароў, якія з родных хат вылецелі ў горад, але не зусім прыжыліся на новым месцы. У прозе аўтара гучаць ноткі суму па страчаным каханні, магчымым шчасці, ён звяртае ўвагу на канфлікт інтарэсаў бацькоў і дзяцей, крыўды, што аднойчы закрадваюцца ў іх душы і застаюцца там на доўгія гады. Героі Стральцова так падобныя да нашых суседзяў-гараджан, а асабліва нашых бабуль і дзядуляў, іх суседзяў і знаёмых, якія жывуць у вёсцы і ўвесь час чакаюць у госці дзяцей з горада.

Публіцыстыка і літаратурна-крытычныя артыкулы Міхася Стральцова напоўнены інтэлектуальнасцю, роздумам, імкненнем зразумець творчыя памкненні сваіх папярэднікаў і сучаснікаў. Напэўна, таму так прэстыжна было ў свой час для пісьменніка, сталага ці маладога, у якога выйшла новая кніга, атрымаць водгук ці рэцэнзію менавіта ад Стральцова. Пра каго б ні пісаў Міхась Лявонавіч — Максіма Багдановіча (а яго творчасць ён асабліва любіў і нават адкрыў наноў для беларускага чытача), Максіма Гарэцкага, Купалу, Коласа, Бядулю, Хадыку, Вялюгіна, Дубоўку (і гэты спіс можна доўжыць і доўжыць) — кожны з яго артыкулаў надзвычай прадуманы па форме і змесце, лагічны і глыбока аналітычны, «інтэлігентны». Тут ёсць і асабістыя ўражанні крытыка як чытача, і аб'ектыўная аналітыка твораў.

Такім лірычным і чуйным, шчырым і ўражлівым, удумлівым і разважлівым можна было пабачыць Стральцова на старонках асобных выданняў яго твораў. Што да новага збору выбранага, то ён змяшчае ўсе гэтыя рысы індывідуальнасці пісьменніка з дадаткам... асабістага, нават інтымнага. Тут ёсць і выбраныя вершы, і апавяданні, аповесць «Адзін лапаць, адзін чунь», аповесць-эсэ «Загадка Багдановіча» і літаратурна-крытычныя артыкулы... Ёсць і фотаздымкі Міхася Стральцова, зробленыя ў розныя гады  з сям'ёй і сябрамі, калегамі і паплечнікамі. Ёсць і грунтоўная прадмова, што змяшчае ўспаміны калег пра творцу, смешныя і сумныя выпадкі з яго жыцця, а таксама напрыканцы выдання каментары, што дапамогуць лепш зразумець асобныя моманты твораў.

А ёсць і раздзел, які асабіста мне чытаць было неяк няёмка. Гэта ліставанне Міхася Лявонавіча з сябрамі, калегамі, жонкай і дачкой. Тут чытаецца бясконцая пяшчота і любоў да блізкіх, адчуваецца віна перад імі (лісты часоў знаходжання Стральцова ў лячэбна-працоўным прафілакторыі ў Мазыры), імкненне дагадзіць і атрымаць дараванне. Гучыць сум і шкадаванне па страчаным часе, адчуваюцца пакуты ад цяжкіх хвароб...

Думаецца, новае выданне збору выбраных твораў Міхася Стральцова дапаможа многім чытачам адкрыць для сябе гэтага аўтара, дадасць да яго партрэта асобныя рысы ці стане магчымасцю пабачыць постаць творцы ўпершыню.

**Марына ВЕСЯЛУХА**

## Азбука народнай культуры

**ад Янкі Крука і Аксаны Катовіч**

МАТЫЛЁК — ва ўяўленні ўсходніх славян звязаны з іншым, «тым», светам, чаму і стала атаясамлівацца з душамі памерлых продкаў. У некаторых рэгіёнах матылёў і сёння завуць «душкамі». У шматлікіх культурах матыль разумеўся, з аднаго боку, як здольнасць да пераўтварэння, змен, як найвышэйшая прыгажосць, з другога боку — як хуткацечнасць і смерць. Усе гэтыя асацыяцыі ўзніклі на падставе біялагічнага развіцця матыля: вусень, які з'яўляецца з адкладзеных яек, сімвалізуе жыццё. Пераўвасабленне вусеня ў кукалку, зімаванне ў такім стане сімвалізуе часовую смерць; з'яўленне ўвесну матылька, якому давядзецца лётаць з кветкі на кветку, стала сімвалам прыгажосці і кахання. Так у вобразе матыля паядналася сімволіка жыцця, смерці і, нарэшце, бессмяротнасці. Матылёк стаў сімвалізаваць душу, якая пакідае цела ў момант смерці. У хрысціянскай традыцыі менавіта выява матылька была на надмагільных камянях. Хрыстос, які трымае на далонях матыля, сімвалізуе ўваскрэсенне.

◈ Здавён было прынята памінаць памерлых, называючы іх імёны, у час, калі шмат матылёў лётае вакол агню.

◈ Паўсюдна існавала строгая забарона забіваць матылькоў. Пры гэтым сталыя людзі казалі: «Не забівай матыля: ён цябе не кране, а можа, гэта твой памерлы дзед ці бацька». Ці так: «Чыясь душа паляцела».

◈ Была распаўсюджана такая прыкмета: калі ў пакой з хворым заляцеў матыль, ён хутка памрэ.

◈ Цікавы факт: на Віцебшчыне на фарбаваных велікодных яйках рабілі адбіткі крылаў матылёў.

◈ Колер матыля, часам чорны, надзяліў гэтую істоту ў народнай свядомасці негатыўнымі якасцямі, быццам бы ён — дэманічная душа, душа ведзьмака ці знахара.

◈ Белыя матылі як сімвал снегу прысутнічалі ў шматлікіх казках, загадках, вершах і г.д.

Па форме і колеру матылёў прадказвалі ўраджай, надвор'е і іншыя падзеі:

◈ Вялікая колькасць белых матылькоў прадказвала шмат малака ў кароў гэтым летам і вялікія дажджы.

◈ Чырвоныя матылі — будзе шмат мёду, а лета будзе сухім.

◈ Па вышыні палёту першых матылькоў меркавалі аб вышыні льну гэтым летам.

# «ДРАЎНЯНЫЯ» ФАНТАЗІІ

**Рэзчыкі па дрэве з Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі і Украіны збіраліся ў агратурыстычным комплексе «Гарадзенскі маёнтак «Каробчыцы» на ўжо традыцыйны міжнародны пленэр.**

На гэты раз яго задача — стварыць кампазіцыю «У Лукамор'я», аб'яднаўшы розныя «драўняныя» фантазіі. Прычым на працягу тыдня за гэтым працэсам мог паназіраць кожны, хто зацікавіцца. І разам з тым адпачыць на прыродзе. Сёлетняя кампазіцыя, як і папярэднія пленэрныя творы, застанецца тут жа, у Каробчыцах. Каб радаваць шматлікіх наведвальнікаў агратурыстычнага комплексу, а таксама служыць прыкладам садружнасці яго гаспадароў са скульптарамі.

Дарэчы, іх сумесная задума — стварыць самую доўгую ў свеце лаўку, якую ўпрыгожаць разнастайныя скульптуры з дрэва. Пачатак ужо пакладзены.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

# ПРИНЯТО РЕШЕНИЕ О ПРИСОЕДИНЕНИИ ЗАО «БЕЛОРУССКИЙ БАНК МАЛОГО БИЗНЕСА» К ЗАО «ИДЕЯ БАНК»

Idea Bank
Отличная идея!

**В соответствии с решением акционеров ЗАО «Идея Банк» (протокол №6 от 12.08.2015) началась процедура присоединения ЗАО «Белорусский банк малого бизнеса» к ЗАО «Идея Банк».**

В соответствии с требованиями действующего законодательства ЗАО «Идея Банк» уведомляет, что письменные требования кредиторов о досрочном прекращении или исполнении соответствующих обязательств Закрытого акционерного общества «Идея Банк» и возмещения им убытков принимаются по адресу: 220034, г. Минск, ул. З. Бядули, д. 11, в течение тридцати дней с даты направления письменного уведомления.

После окончательного присоединения капитал Идея Банка вырастет на 14,7% и составит 532 032 млн. руб.

Сделка по покупке ЗАО «Белорусский банк малого бизнеса» польским финансовым холдингом Getin Holding была завершена 18 октября 2013 г. За 2 года все клиенты Белорусского банка малого бизнеса перешли на обслуживание Idea Bank Business.

*«Теперь клиенты Белорусского банка малого бизнеса пользуются всеми возможностями и привилегиями Idea Bank Business: персональный менеджер, обслуживание в отделениях нового формата, новые продукты и услуги.*

*В 2015 году Идея Банк привлек для финансирования малого и среднего бизнеса $7,7 млн. от Европейского банка реконструкции и развития. Это позволило пересмотреть кредитную линейку и предложить более выгодные условия нашим клиентам. В том числе благодаря этому мы увеличили кредитный портфель на 15,3% с начала года. Сегодня кредитный портфель юридических лиц составляет 545 571 млн. руб.», – прокомментировала Председатель Правления ЗАО «Идея Банк» Елена Михайловна ПАПУШЕВА.*

Международный бренд Idea Bank работает в четырех странах Восточной Европы: Польше, Беларуси, Украине и Румынии. В состав холдинга также входят лизинговые и финансовые консультационные компании.

**7555 с мобильных телефонов** **Ideabank.by**

Закрытое акционерное общество «Идея Банк» (ЗАО «Идея Банк»). Свидетельство о регистрации от 24 апреля 2004 года. Лицензия на осуществление банковской деятельности № 25 от 03.06.2013 года. УНП 807000122

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ООО «МИЗАНО» (понижение цены на 35%)

| | | | |
|---|---|---|---|
| | **Лот №1** | | |
